ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

Выдаецца
з 9 чэрвеня 1917 г.

# ЗВЯЗДА

26 чэрвеня 2014 г. ЧАЦВЕР № 118 (27728) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Рэцэпт настрою ад Віталя Карпанава



Як не заблукаць у «медыя-джунглях»?




«ЧЗ» называе імёны пераможцаў творчага конкурсу

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Леанід МАЛЬЦАЎ:**

*«Мяжа Саюзнай дзяржавы працуе не толькі на бяспеку Расіі і Беларусі, але і Еўразійскага саюза. Мы не пускаем у ЕС (я маю на ўвазе мы — Беларусь і Расія) наркотыкі і незаконных мігрантаў... Найбольш характэрныя для ўсяго свету цяпер такія выклікі і пагрозы, як незаконнае перамяшчэнне праз мяжу людзей, матэрыялаў і ўсяго іншага, звязанага з тэрарызмам».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.06.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10190,00 | ▲ |
| Еўра | 13870,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 300,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 856,66 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# «АД РОДНАЕ ЗЯМЛІ, АД ГОМАНУ БАРОЎ...»

**Тэрыторыю мемарыяльнага дома-музея Якуба Коласа ў Мінску нядаўна аздобілі вялізныя драўляныя скульптуры герояў класічных твораў пісьменніка «На ростанях» і «Сымон-музыка». Аўтар драўляных фігур — народны майстар, разьбяр-скульптар Сяргей КЛЯШЧУК — імкнуўся зрабіць іх такімі, як у творах Коласа — добрымі і таленавітымі. Унучка Яна адна з першых ацаніла работу мастака: выразаны дзедам Сымон-музыка прыйшоўся ёй даспадобы.**



Фота Анатоля ВІКТАРАВА.

■ Супраць залежнасці

## БУДЗЕ ЯШЧЭ БОЛЬШ ЖОРСТКА

### За ўжыванне псіхаактыўных рэчываў без прызначэння ўрача трэба адказваць

**Падчас чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску затрымалі маладых людзей, якія збывалі курыльныя сумесі і «маркі» праз інтэрнэт з дапамогай «тайніка» і дробных распаўсюджвальнікаў. Падчас вобыску боксаў і гаражных кааператываў, якія арандавалі затрыманыя ў Мінску і Мінскім раёне, аператыўнікі канфіскавалі 14 кг «парашку» і 2 кг гатовых курыльных міксаў. Калі б групіроўцы ўдалося ператварыць усю партыю ў гатовы тавар, гэта было б 1,5 мільёна доз коштам звыш 5,5 млн долараў на чорным рынку...**

Яшчэ вясной у сталіцы затрымалі 24-гадовага жыхара мікрараёна Шабаны. У сябе дома беспрацоўны малады чалавек арганізаваў выраб курыльных сумесяў накшталт «спайсу». Было канфіскавана і лабараторнае абсталяванне, і звыш 100 г сумесяў, якія змяшчалі розныя псіхатропныя рэчывы.

СТАР. 3

■ Лёсы

## УЦЯЧЫ АД ВАЙНЫ...

### або Калі жыццё важней за нажытае

ШМАТДЗЕТНАЯ СЯМ'Я СА ЖЛОБІНА ДАПАМАГАЕ БЕЖАНЦАМ З УСХОДУ УКРАІНЫ

**За менш як два тыдні выратаванне на Жлобіншчыне знайшлі 13 украінцаў. Маладая сям'я Крапіцкіх дапамагае ім з дакументамі, жыллём, працай. А пачалося ўсё з таго, што Надзя з Алегам убачылі ў «Аднакласніках» слёзныя просьбы аб дапамозе зусім незнаёмых людзей. Вырашылі дапамагчы адной-дзвюм сем'ям...**

СТАР. 4



**Надзея Крапіцкая** *(злева)* **радуецца, што Таццяна Іванаўна і яе ўнучка** *(у цэнтры)* **сустрэлі на жлобінскай зямлі былых суседзяў.**

1944-2014 70 гадоў вызвалення

# ЭСТАФЕТА ПАМЯЦІ — МАЛАДОМУ ПАКАЛЕННЮ

## Турысцкі злёт навучэнцаў Саюзнай дзяржавы сёлета носіць патрыятычны характар

**Знаёмства школьнікаў з Беларусі і Расіі пачалося з грамадзянска-патрыятычнай акцыі з ускладаннем гірлянды да манумента Перамогі. Сімвалічна, што сёлетні злёт уключаны ў план мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы, прымеркаваных да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Турысцкі злёт вось ужо дзявяты год запар праводзіцца па ініцыятыве Міністэрства адукацыі Беларусі і Міністэрства адукацыі і навукі Расіі пры актыўнай фінансавай і арганізацыйнай падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы.

— З кожным годам гэтае мерапрыемства набывае ўсё большую значнасць і маштабнасць, — зазначыў **міністр адукацыі Рэспублікі Беларусі Сяргей МАСКЕВІЧ.** — Сёлета ў моладзі вельмі насычана не толькі адукацыйная праграма, але і тая, якая звязана з ваенна-патрыятычным выхаваннем. Школьнікі наведаюць шматлікія месцы баявых дзеянняў, пазнаёмяцца з сённяшняй Беларуссю. Запланаваны сустрэчы з ветэранамі. Хочацца, каб турысцкі злёт паўплываў на фарміраванне сяброўскіх сувязяў, іх умацаванне. Важна, каб хлопцы і дзяўчаты маглі адчуць тое, што зрабілі для іх дзяды і прадзеды 70 гадоў таму на гэтай гераічнай беларускай зямлі.

Больш чым 600 падлеткаў на працягу тыдня будуць спаборнічаць паміж сабой. 34 каманды з розных рэгіёнаў Расіі і 8 каманд ад Беларусі (дзве ад Мінскай вобласці і па адной з іншых абласцей краіны) змогуць праявіць сябе як у спартыўных, так пазнавальна-асветніцкіх і краязнаўчых конкурсах.

— У Беларусі і Расіі гістарычнае і духоўнае адзінства, — падкрэсліў **кіраўнік прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Міхаіл ОРДА.** — У нашых народаў — агульны лёс і адна на ўсіх непадзельная, бессмяротная, нязгасная слава Вялікай Перамогі над фашызмам. Мільёны беларусаў і расіян аддалі свае жыцці на алтар агульнай Перамогі. Подзвіг народа бессмяротны, бо бессмяротная народная памяць. Яна жыве ў сэрцы кожнага з нас і будзе перадавацца будучым пакаленням. І сёння вы, юныя грамадзяне Беларусі і Расіі, прымаеце эстафету памяці, якую павінны берагчы як самае святое і пранесці праз усё жыццё.

Асноўныя мерапрыемствы злёту пройдуць у Мядзельскім раёне. У апошні дзень школьнікі наведаюць гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна».

Як прызналася ўдзельніца дэлегацыі ад Мінскай вобласці Вікторыя Цішкавец, усіх іх аб'ядноўвае любоў да турызму. «Мы лічым, што турызм развівае тыя якасці, якія дазволяць нам у любой прафесіі дабіцца значных вынікаў і гэтым забяспечыць росквіт нашых дзяржаў, іх незалежнасць», — пераканана дзяўчына.

Штогадовае правядзенне турысцкага злёту навучэнцаў Саюзнай дзяржавы садзейнічае фарміраванню патрыятызму, здаровага ладу жыцця моладзі, развіццю сяброўскіх сувязяў паміж юнымі прадстаўнікамі Беларусі і Расіі. Злёт збірае аднадумцаў, спартсменаў, інтэлектуалаў.

**Вераніка КАНЮТА.**

■ Святкуем разам!

# ПАРАД ПЕРАД САЛЮТАМ

## 3 ліпеня ён пачнецца а палове дзясятай вечара

**«У дні святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі запланавана каля 80 маштабных гарадскіх і раённых мерапрыемстваў», — паведаміў намеснік кіраўніка ўпраўлення культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама Сяргей МЯДЗВЕДЗЕЎ.**

Галоўным месцам масавых святкаванняў у сталіцы стане пляцоўка каля Палаца спорту — яна будзе працаваць 2 і 5 ліпеня з 17 да 22 гадзін, 3-4 ліпеня — з 12 да 2 гадзін. А 2 ліпеня а 16 гадзіне адкрыецца новае памяшканне Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, наведаць які можна будзе, пачынаючы з 4 ліпеня.

«Мы чакаем многа дэлегацый з розных куткоў свету, — адзначыў Сяргей Мядзведзеў. — Прыедуць мэры і прадстаўнікі гарадоў-герояў з рэспублік былога Савецкага Саюза. «Цягнік памяці і славы» з Санкт-Пецярбурга мусіць прыбыць у сталіцу 2 ліпеня — гэта вялікая дэлегацыя ветэранаў, моладзі, творчых калектываў, журналістаў».

З Расіі, Украіны прыедуць прадстаўнікі пастоў №1, якія 2 ліпеня правядуць сумесную акцыю «Нашчадкі вялікай гісторыі»: маладыя людзі з трох краін будуць несці ганаровую вахту ля манумента Перамогі.

У асноўны дзень святкавання, 3 ліпеня, арганізатары вырашылі правесці ўрачыстыя мерапрыемствы ўвечары. У 21.30 пачнецца тэатралізаванае шэсце «Беларусь — ад вызвалення да незалежнасці» і парад ваеннай тэхнікі, якія пасля плаўна пяройдуць у рэспубліканскі гала-канцэрт «Дарогамі вызваліцеляў» (у 22.50). Традыцыйна пройдзе акцыя «Праспяваем гімн разам» (у 23.45), а апоўначы ўсіх чакае святочны салют. Выступленне скончыцца а 2-й гадзіне ночы, транспарт у гэты дзень будзе працаваць да 3 гадзін.

У Батанічным садзе 4 ліпеня пройдзе акцыя па высаджванні алеі «Бэз Перамогі». 4-5 ліпеня на пляцоўцы каля Палаца спорту будзе праводзіцца рэспубліканская выстава-кірмаш «Беларускі сувенір», у якой прымуць удзел рамеснікі з усіх абласцей Беларусі. Пройдуць майстар-класы, будзе арганізаваны продаж сувенірнай прадукцыі.

Запланаваны таксама і іншыя падарункі для жыхароў сталіцы. Па словах Сяргея Мядзведзева, напярэдадні святкаванняў будуць адкрыты новыя інтэрнаты, многафункцыянальны аўтамабільны комплекс на вуліцы Берута, цэнтр гандлёва-бытавога абслугоўвання «Квадра» на вуліцы Налібоцкай, а наваселлю прымуць жылыя дамы — усяго будзе ўведзена ў эксплуатацыю 16 сацыяльна значных аб'ектаў.

**Кацярына РАДЗЮК**

■

# МЕДАЛІ ЎРУЧЫЛІ Ў ШПІТАЛІ

**Больш за 9 тысяч чалавек на Гомельшчыне ўзнагародзяць юбілейнымі медалямі да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У іх ліку 3,5 тысячы ветэранаў вайны, а таксама былыя малалетнія вязні канцэнтрацыйных лагераў.**


Сярод узнагарод ветэрана вайны Рыгора АМЕЛЬЧАНКІ з'явілася яшчэ адна.
Фота БЕЛТА.

Рыгор Іванавіч Амельчанка цяпер праходзіць лячэнне ў Гомельскім абласным клінічным шпіталі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Ён прайшоў вайну з самага пачатку і да канца. Як кажа — ад абароны Масквы да ўзяцця Берліна. Быў паранены, але не страчвае сілы духу і добрая ўсмешка не пакідае яго твар:

— Дзякуй нашай дзяржаве за ўсё. Трэба весці барацьбу за мір і спакой. Ветэраны павінны расказваць моладзі, як абараняць Радзіму, бо Радзіма — важней за ўсё.

Свой юбілейны медаль ветэран урачыста атрымаў непасрэдна ў шпіталі, як і іншыя ветэраны і былыя малалетнія вязні. Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Алег Барысенка павіншаваў усіх са святам:

— Мяне заўсёды здзіўляла ваша сіла духу і ўменне пераадольваць жыццёвыя нягоды. Вы ваявалі літаральна за кожны дзень жыцця ў гады вайны, а цяпер годна пераносіце хваробы, прычынай якіх з'яўляюцца і перажытыя раненні. Дзякуй вам за мужнасць, нізкі паклон за ўсё, што вы зрабілі для нашай краіны.

Старшыня абласнога Савета дэпутатаў абышоў асабіста ўсіх пажылых людзей, якія прадстаўлены да ўзнагароды, перадаў ім юбілейныя медалі і кветкі. Тым, хто па стане здароўя не змог прыйсці ў актавую залу самастойна, медаль уручаў у бальнічнай палаце. Алег Барысенка азнаёміўся таксама з лячэбнай базай шпіталя, з умовамі, якія створаны там для ветэранаў вайны і былых малалетніх вязняў фашызму. Дарэчы, на ўсёй тэрыторыі шпіталя створана безбар'ернае асяроддзе, што дазваляе пацыентам з вельмі абмежаванай мабільнасцю самастойна наведваць лячэбныя і дапаможныя падраздзяленні.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# Імёны ў граніце

**Каля трох тысяч імёнаў чырвонаармейцаў нанесена на 56 мемарыяльных пліт, якія будуць урачыста адкрыты 27 чэрвеня каля помніка «Звязда» горацкага аграгарадка Леніна, што на Магілёўшчыне.**

Каля тысячы пазначаных на граніце прозвішчаў устаноўлена за апошнія два гады супрацоўнікамі аддзела ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Горацкага райвыканкама пры дапамозе Васіля Матыскіна, крычаўскага пенсіянера, які актыўна займаецца пошукавай працай. У спісе — імёны савецкіх салдат і афіцэраў, якія загінулі ў баях за вызваленне раёна. Спіс яшчэ не канчатковы. Таму тры пліты з 56 пакуль што чыстыя. На іх будуць наносіць прозвішчы, якія ўдасца выявіць падчас далейшай пошукавай працы.

На месцы былых баёў пад Леніна 27 чэрвеня адбудзецца таксама перапахаванне чатырох байцоў Савецкай Арміі, астанкі якіх былі знойдзены падчас пошукавых работ. На жаль, прозвішчы загінулых невядомыя.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Борисовбытсервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества:**

**Лот № 1: комплексный приемный пункт** общ. пл. **59,6 кв.м**, инв. № 610/С-54702, на земельном участке пл. **0,0113 га** (предоставлен на праве аренды) в Борисовском районе, д. Большое Стахово, ул. Чуры, д. 2А. **Начальная цена с НДС – 53 875 280 бел. руб.**; Недвижимое имущество обременено договором аренды (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

**Лот № 2: комплексный приемный пункт** общ. пл. **50,9 кв.м.**, инв. № 610/С-54701, на земельном участке пл. **0,0089 га** (предоставлен на праве аренды) в Борисовском районе, д. Корсаковичи, ул. Центральная, д. 1. **Начальная цена с НДС – 36 952 880 бел. руб.**

**Задаток в размере 10% от начальной цены объектов перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **28.07.2014** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.07.2014** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

■ Будзь у курсе

# ПАВІНШАВАЦЬ АДНАПАЛЧАН

## Міжгародныя тэлефонныя размовы ўнутры Беларусі для ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны з 1 па 5 ліпеня будуць бясплатнымі

У дні святкавання 70-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў кампанія «Белтэлекам» робіць бясплатнымі тэлефонныя размовы ўнутры краіны для ўдзельнікаў вайны з хатніх тэлефонаў, у аддзяленнях сувязі і з вылучаных тэлефонаў шпіталяў.

«Ажыццявіць бясплатны званок можна, набраўшы нумар выклікаемага абанента самастойна або зрабіўшы заказ бясплатнай міжгароднай тэлефоннай размовы з дапамогай тэлефаніста па тэлефонах: для абанентаў Брэста і Брэсцкай вобласці — 8-18, Віцебска і Віцебскай вобласці — 8-18; Гомеля і Гомельскай вобласці — 8 -13; Гродна і Гродзенскай вобласці — 8-13; Мінска і Мінскай вобласці — 8-13, 8-18; Магілёва і Магілёўскай вобласці — 8-18», — паведамілі ў прэс-службе «Белтэлекама».

Дадаткова для міжнародных размоў удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны разаслана больш за 20 тысяч сэрвісных тэлефонных картак наміналам 16 тысяч тарыфных адзінак, з дапамогай якіх можна патэлефанаваць у самыя розныя краіны.

Даведкі па прадастаўленні міжнародных тэлефонных размоў пры дапамозе сэрвісных тэлефонных картак даюцца па тэлефоне 176 або 8-805-100 4444, а інфармацыю па прадастаўленні бясплатных міжгародніх тэлефонных размоў можна атрымаць па тэлефоне адзіных даведачна-інфармацыйных службаў 153, 130.

■ Увага, конкурс!

# КВЕТНІК І АГАРОД... НА БАЛКОНЕ

**Стаміліся ад панавання «каменных джунгляў» і хочаце быць бліжэй да прыроды? Зрабіце са свайго балкона маленькую аранжарэю ці мініяцюрны аазіс! Тым больш што зараз экалагічнае таварыства «Зялёная сетка» праводзіць гарадскі конкурс на лепшы сад-агарод, створаны на балконе. Каб прыняць у ім удзел, дастаткова даслаць фотаздымак свайго квітнеючага зялёнага балкона на электронны адрас арганізатараў pressgreenbel@gmail.com. Заяўкі прымаюцца да 24 ліпеня. Пераможца атрымае каштоўны прыз — «Набор садавода».**

Арганізатары хочуць разбурыць галоўны стэрэатып, што балкон — гэта месца для сушкі адзення. Не, ён — «зялёны праваднік» паміж кватэрай і вуліцай. На ім можна стварыць куток прыроды, месца для адпачынку і творчасці. «Занятак тут знойдзецца кожнаму — мама будзе займацца кветкамі, дзеці — назіраць, гуляць і дапамагаць вырошчваць самыя непатрабавальныя расліны, а тата, як выдатны кулінар, можа даглядаць агарод з зяленівам і травамі», — адзначыла Вольга ШЧЫГЛІНСКАЯ, эксперт па пермакультурным дызайне ўстановы «АграЭкаКультура». Балкон — гэта пляцоўка для сямейных эксперыментаў.

*...Хочаце зрабіць балкон жывым, але не ведаеце, як? Вольга Шчыглінская прапанавала ўніверсальныя парады для садаводаўпачаткоўцаў. «Насамрэч усё залежыць ад канкрэтнага балкона і ад самога чалавека — а вырасціць на балконе можна ўсё, калі гэтым займацца», — адзначыла суразмоўца.*

✔ Першае, з чым трэба вызначыцца — тып і размяшчэнне балкона. Найбольш удалымі напрамкамі традыцыйна лічацца ўсходні, паўднёва-ўсходні, паўночна-ўсходні бакі: тут раслінам будзе дастаткова сонечнага святла. На поўначы, наадварот, цёмна, але гэта ідэальны варыянт для ценелюбівых кветак: бягоній, фуксій, настурцый, вострых траў. Паўднёвыя балконы — добрыя прыстанкі для вынослівых раслін: гэта самыя спякотныя месцы, дзе добра прыжывуцца кактусы, пеларгоніі і петуніі.

✔ Лепш за ўсё вызначыцца адразу, ці здолееце вы надзяляць шмат часу і ўвагі свайму балкону-кветніку. Пачынайце з простых раслін — гэта дазволіць развіць «нюх» на раслінаводства. Сярод самых жывучых спецыяліст пералічыла «грашовае дрэва», алоэ, аксаміткі, маладзіла, сукуленты. Вольга адзначыла і розныя віды календулы, цыніі, паліянтавыя ружы, павойныя расліны — напрыклад, духмяны гарох.

✔ Пасля варта заняцца пошукам насення ці расады. Вольга рэкамендуе пачаткоўцам набываць менавіта расаду: так працэй упэўніцца, што вы выбралі «сваю» расліну. Гаршкі лепш за ўсё набываць непразрыстыя, светлага колеру, керамічныя і з тоўстымі сценкамі. У такіх ёмістасцях глеба не будзе перасыхаць, што вельмі важна, бо балконныя расліны абмежаваны ў прасторы. А для расады добра падыходзяць і тарфяныя гаршкі.

✔ Наступны крок — падрыхтоўка глебы. Калі ёсць магчымасць, зрабіце кампост з лісця і рэштак раслін — гэта вельмі ўдалае арганічнае ўгнаенне. Паверхню грунту варта пасыпаць пярлітавай крошкай, пажадана белага колеру: яна паслужыць абаронай ад перагрэву глебы. Цяпер можна высаджваць!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

✔ У летні перыяд востра стаіць праблема з палівам раслін, асабліва калі трэба пакінуць дом і балкон без нагляду на пэўны час. Вольга Шчыглінская прапанавала дзейсны народны спосаб паліву для такіх выпадкаў: ставіце ёмістасць з вадой вышэй па ўзроўні за вазоны, пасля робіце льняны шнур і апускаеце яго адным краем у ваду, а другім — у гаршчок. Прыстасаванне падтрымае добры паліў на 2-3 дні.

✔ І не забывайцеся: балкон — гэта прастора для вашай фантазіі і творчасці! Уявіце, якім прыгожым можа стаць горад, калі большасць балконаў у дамах ператворыцца ў зялёныя сады — па адпачынак далёка хадзіць не прыйдзецца.

**Кацярына РАДЗЮК** ■

■ Вакол футбола

## Уругвай паказаў зубы

**Для італьянскіх футбалістаў чэмпіянат пачынаўся на мажорнай ноце. Пераканаўчая перамога над англічанамі, пахвальныя водгукі журналістаў, статус аднаго з фаварытаў... Але паражэнне ад зборнай Коста-Рыкі (а галоўнае, невыразная гульня «скуадра адзуры» ў гэтым матчы) паставіла пад сумненне пападанне італьянцаў у плэй-оф. Каб здабыць пуцёўку ў 1/8 фіналу, еўрапейцам было дастаткова згуляць унічыю з камандай Уругвая. У той жа час лацінаамерыканцы настройваліся толькі на перамогу. Прычым, здаецца, любой цаной.**

Барацьба атрымалася жорсткай, з вялікай колькасцю парушэнняў, часам даволі грубых. Жоўтая картка Марыа Балатэлі, выдаленне Клаўдыа Маркізіа, траўма Марка Вераці... Але галоўны «зоркай» футбольнага вечара стаў форвард зборнай Уругвая Луіс Суарэс. Лепшы гулец чэмпіянату Англіі ў складзе «Ліверпуля» ў барацьбе з Джорджа К'еліні не стрымаўся і... укусіў італьянца за плячо. Арбітр спыніў сустрэчу, але не стаў паказваць уругвайцу "гарчычнік".



Луіс Суарэс літаральна зубамі чапляўся за кожную магчымасць дапамагчы сваёй камандзе.

Дарэчы, гэта не першы падобны выпадак у кар'еры Суарэса. У 2010 годзе, выступаючы за «Аякс», ён укусіў у шыю абаронцу ПСВ Атмана Бакала падчас масавай сутычкі. Тады галандская федэрацыя дыскваліфікавала ўругвайца на сем матчаў, а кіраўніцтва «Аякса» выпісала яму сур'ёзны штраф. Наступнай ахвярай лацінаамерыканскага «ваўкалака» стаў абаронца «Чэлсі» Браніслаў Іванавіч. І зноў — дзесяць матчаў дыскваліфікацыі і штраф. Пасля гэтага эпізода ўругвайскі футбаліст прасіў прабачэння ў англійскай публікі, казаў, што пасталеў і больш падобных памылак дапускаць не будзе. Але, як бачым, развітацца са шкоднымі звычкамі не так проста.

Цяпер Суарэсу застаецца сачыць за расследаваннем ФІФА і спадзявацца, што федэрацыя вынесе яму мінімальнае пакаранне ў выглядзе дыскваліфікацыі на 24 матчы. У крайнім выпадку ўругваец можа прапусціць два гады.

Гэты інцыдэнт, здаецца, адцягнуў увагу не толькі ад гола Дыега Гадзіна, але і ад выніковай перамогі каманды Уругвая. Між іншым, пасля гэтага паражэння галоўны трэнер італьянскай зборнай Чэзарэ Прандэлі, які выводзіў сваю зборную ў фінал чэмпіянату Еўропы-2012, падаў у адстаўку.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

### Але камусьці ўчынак Луіса Суарэса прынёс грошы...

Нарвежскі футбольны балельшчык Томас Сіверс выйграў 5600 крон, зрабіўшы стаўку на тое, што форвард зборнай Уругвая Луіс Суарэс укусіць каго-небудзь падчас матча з Італіяй.

Букмекеры ацэньвалі выйгрыш з верагоднасцю 175 да 1. Стаўка Сіверс складала 32 кроны. У выніку і 23-гадовы балельшчык зарабіў амаль што тысячу долараў. Вось гэта празорлівасць!

# БУДЗЕ ЯШЧЭ БОЛЬШ ЖОРСТКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Экспертыза паказала, што выяўленыя рэагенты былі аналагічныя тым, якія прывялі да шэрагу лятальных зыходаў падлеткаў, а таксама да цяжкіх злачынстваў, учыненых у гэтым годзе маладымі людзьмі ў стане наркатычнага ап'янення.

А ў сярэдзіне чэрвеня на праспекце Пераможцаў падчас рэалізацыі насення маку былі затрыманы мінчанін, у якога ў пяці здымных гаражах выўлена і канфіскавана амаль 2,5 т расліны. Мужчына на працягу двух гадоў пастаўляў мак у Беларусь з Заходняй Еўропы і прадаваў наркаспажыўцам. Для гэтага была нават арганізавана сетка наркатаксі, якія фактычна манапалізавалі збыт дурману ў трох раёнах сталіцы.

Дарэчы, за парушэнне падпісанага сёлета Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб некаторых пытаннях дзяржаўнага рэгулявання абароту насення маку» ужо складзена 75 адміністрацыйных пратаколаў у дачыненні да 64 асоб, з незаконнага абароту канфіскавана звыш 38 т наркасыравіны, спагнана штрафаў на 122 млн рублёў, канфіскавана 8 аўтамабіляў.

Жорсткія меры ў дачыненні да гандляроў макам змяніла рынак абароту наркотыкаў у нашай краіне, і цяпер у нас дамінуюць курыльныя сумесі, на долю якіх выпадае да 70 працэнтаў. Каля 10 працэнтаў прыпадае на опіумныя наркотыкі, астатнюю «нішу» займаюць марыхуана, амфетаміны і наркатычныя медпрэпараты, якія трапілі ў нелегальны абарот.

**Начальнік упраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Мікалай КАРПЯНКОЎ** сцвярджае:

— Колькасць перадазіровак істотна зніжаецца, смяротныя выпадкі цяпер наогул адсутнічаюць, і гэта з'яўляецца вынікам мэтанакіраванай работы МУС і СМІ. Кан'юнктура наркарынку змянілася апошнім часам, і мы ідзём да таго, каб усе курыльныя сумесі, якія маглі б з'явіцца на гэтым рынку, былі забаронены. Летась у Рэспубліканскі пералік наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў, якія падлягаюць дзяржаўнаму кантролю, трапілі 73 новыя рэчывы, сёлета — ужо 63. І гэты працэс працягваецца.

Мы маніторым інтэрнэт і ўжо затрымалі асноўных наркадылераў, якія арганізавалі форумы, магазіны для маштабнага продажу наркарэчываў. Злачынцы былі затрыманы ў момант ажыццяўлення здзелак. Цяпер працуем і па «сярэдніх» распаўсюджвальніках — затрымліваем гандляроў «раённага» маштабу. Сёлета органамі ўнутраных спраў заведзена 3330 крымінальных спраў, з іх адносна курыльных сумесяў — 2330. Гэта на 1335 крымінальных спраў больш, чым за аналагічны леташні перыяд.

Калі летась мы выявілі 150—160 збытчыкаў насення маку, то цяпер размова ідзе пра 30—40 асоб. Некаторыя з іх двойчы ці нават і тройчы затрымліваліся, і цяпер мы вырашылі пайсці іншым шляхам, паколькі ў нас з'явіліся падставы прыцягваць да крымінальнай адказнасці ў першую чаргу сістэмных збытчыкаў насення маку.

**26 чэрвеня — Міжнародны дзень барацьбы з наркатычнымі сродкамі і іх незаконным абаротам.**

Што да насваю, снюсу і іншых некурыльных тытунёвых вырабаў, прызначаных для рассмоктвання, жавання або нюхання, то абарот іх на тэрыторыі краіны, само сабой, забаронены, паколькі іх уздзеянне падобна на ўздзеянне псіхатропаў. Сёлета ўжо канфіскавана 673 кг насваю. Не выключана, што і за збыт жавальнага тытуню будзе ўведзена крымінальная адказнасць.

— З удзелам усіх зацікаўленых дзяржаўных органаў распрацаваны законапраект, які прадугледжвае больш жорсткае крымінальнае пакаранне за збыт наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў непаўналетнім, за выраб наркотыкаў ва ўмовах лабараторыі, увядзенне адміністрацыйнай адказнасці за ўжыванне псіхаактыўных рэчываў без прызначэння ўрача, — кажа **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ.** — Таксама пашыраецца паняцце «аналагаў» наркатычных сродкаў і псіхатропаў, што дазволіць мінімізаваць знаходжанне ў абароце так званых «легальных» наркотыкаў. Гэтым жа законапраектам прадугледжваецца стварэнне міжведамаснай антынаркатычнай камісіі, якая будзе надзелена паўнамоцтвамі выпрацоўкі стратэгіі аператыўнага прыняцця рашэнняў у вышэйзгаданай галіне. Акурат сёння праект закона будзе разглядацца ў першым чытанні.

— Паказчык распаўсюджанасці наркаманіі ў Беларусі — 167 на 100 тысяч насельніцтва (у Расіі — 250, ва Украіне — 195), — дадае **кіраўнік Цэнтра маніторынгу наркасітуацыі, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Уладзімір ЛЯЛЕВІЧ.** — За апошнія пяць гадоў колькасць наркаспажыўцоў павялічылася на 36 працэнтаў. Найбольшы рост — у Мінску. 42 працэнты выяўленых наркаспажыўцоў у першыя тры месяцы года — мінчане. Хоць у цэлым у «лідарах» застаюцца Салігорск, Пінск і Светлагорск, дзе паказчыкі наркаспажывання ў 1,5-2 разы вышэй. Самая нізкая распаўсюджанасць — у Магілёўскай вобласці.

У першым квартале мы назіралі рост выяўлення новых нарказалежных у параўнанні з папярэднім годам, і, галоўным чынам, гэты рост абумоўлены ўжываннем курыльных сумесяў накшталт спайсу. Калі два гады таму ў нас быў зафіксаваны адзін спажывец курыльных сумесяў, то сёння ўжо 570, і 266 з іх выяўлены ў пачатку гэтага года.

— Некалі большая частка людзей, схільных да дэвіянтных (з адхіленнем ад прынятых нормаў) паводзін, да ўжывання наркарэчываў, спажывала опій, аднак цяпер залежнасць фарміруецца ад псіхастымулятараў і сінтэтычных канабіноідаў. Магутная работа па процістаянні распаўсюджванню тых жа курыльных сумесяў праведзена не дарэмна. Калі ў пачатку года ў РНПЦ псіхічнага здароўя знаходзіліся па некалькі дзясяткаў чалавек з псіхозамі, звязанымі з ужываннем так званых спайсаў і міксаў, то цяпер гэта адзінкавыя выпадкі, — кажа **галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Іван КАНАРАЗАЎ.**

**Жорсткія меры ў дачыненні да гандляроў макам змяніла рынак абароту наркотыкаў у нашай краіне, і цяпер у нас дамінуюць курыльныя сумесі, на долю якіх выпадае да 70 працэнтаў.**

Кожны наркаспажывец можа звярнуцца па дапамогу да любога нарколага для атрымання спецыялізаванай дапамогі. Аднак гэтыя людзі павінны звяртацца не толькі па прычыне перамагання самой залежнасці, але і як аднесеныя да групы рызыкі па ВІЧ-інфекцыі і туберкулёзе. Трэба разумець, што перамаганне распаўсюджанасці наркарэчываў — справа ўсіх, а значыць, калі нам становіцца вядома аб фактах ужывання ці распаўсюджвання, не трэба іх утойваць. Гэта не той выпадак, каб заставацца маўклівым сведкам.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# УЦЯЧЫ АД ВАЙНЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## «Каб дзеці раслі з татам»

Першай прыехала Вольга Патапенка з дзвюма дочкамі з горада Бранка Луганскай вобласці. Каб пазнаёміцца з жанчынай, я выправілася ў Касакоўку. Менавіта ў гэтай вёсцы, што непадалёку ад Жлобіна, знаходзіцца былая школа, якую арандуе ў жлобінскага прадпрымальніка сям'я Крапіцкіх. Цяпер туды з усіх куткоў Беларусі неабыякавыя людзі вязуць прадукты, адзенне, мэблю, бытавую тэхніку, посуд, дзіцячыя цацкі — усё, што можа спатрэбіцца бежанцам. Шчыра прызнацца, тое, што я ўбачыла, вельмі ўразіла: за некалькі дзён валанцёры назбіралі столькі рэчаў і прадуктаў, што іх хопіць, каб абставіць, апрануць і накарміць цэлую вёску. Мясцовая гаспадарка нават выдзеліла вартаўніка, каб ахоўваць усё гэта дабро.

Пакуль што ўсе пяць украінскіх сем'яў, якія прыехалі ў Беларусь, прыстроілі ў добрых людзей у Жлобіне, Гомелі і прылеглых вёсках. Але ў будучым, калі будзе патрэба, украінцаў, якія ратуюцца ад вайны, можна будзе сяліць і ў прасторных класах былой Касакоўскай школы. З дапамогай памочнікаў Надзя з Алегам абсталявалі іх мэбляй, павесілі фіранкі.

Сярод рэчаў, якія не перастаюць прывозіць валанцёры, я і знайшла маладую маці — Вольгу Патапенку.

— У горадзе знаходзілася дзве групы вайскоўцаў. Хто яны і да якога боку належаць, ніхто з мясцовых жыхароў не ведае, — распавядае жанчына. — Незадоўга да майго ад'езду папаўзлі чуткі, што Бранку пачнуць бамбіць, што 15 чэрвеня горад заблакіруюць і не будзе магчымасці выехаць. Я не стала чакаць, узяла дачок і паехала ў Беларусь. Папярэдне знайшла Алега ў «Аднакласніках», спісалася, спытала, ці ёсць магчымасць прыехаць. У адказ прыйшло «канешне». У той жа момант мы сабралі чамаданы, дакументы і паехалі. Узяла з сабой мультыварку і крупы, каб, калі ніхто ў Жлобіне не сустрэне, хоць дзяцей пакарміць на вакзале. Маці мая вельмі перажывала, тэлефанавала мужу, казала: «Угавары яе хоць бы дзяцей пакінуць. Навошта яна ў нікуды іх цягне?» Я ж нікога не слухала, разумела, што, як маці, павінна вывезці дзяцей падалей ад вайны.

Паводле слоў Вольгі Патапенкі, горад пакідаюць усе, хто можа кудысьці паехаць. Хтосьці бярэ пуцёўкі за мяжу, хтосьці едзе ў Расію.

— Мае знаёмыя ўсёй сям'ёй паехалі ў Маскву, каб перачакаць увесь гэты хаос. Пакуль мы тут, за домам будзе прыглядаць мая мама.

У гэты момант да нас падыходзіць малады мужчына. «Гэта мой муж, Дзяніс. Дзякуй Богу, ён цяпер з намі».



Сям'я Патапенкаў (на пярэднім плане) пры дапамозе валанцёра перавозіць рэчы ў новую кватэру.

Дзяніс распавёў, што ён не збіраўся спачатку нікуды ехаць са свайго горада. Бо там жа дом, гараж, сабака, высокааплатная праца. Праводзіў жонку з дочкамі ў Кіеў, пасадзіў на аўтобус «Кіеў—Жлобін». І ўзяў зваротны білет дадому.

— Але, на шчасце, не паспеў даехаць. Па дарозе патэлефанавала мая мама. Сказала, што па радыё абвясцілі аб усеагульнай мабілізацыі. Я звязалася з мужам па тэлефоне і папрасіла прыехаць у Жлобін. Толькі каб засталася ў нас сям'я, каб дзеці раслі з татам. Дабіраўся Дзяніс у Беларусь праз Расію. Добрыя людзі дапамаглі яму набыць электронны білет.

На Жлобіншчыне сям'я Патапенкаў менш як два тыдні, а ім ужо прапанавалі працу ў мясцовай гаспадарцы: Волі — бухгалтара, Дзянісу, яе мужу, — загадчыка гаража. Выдзелілі аднапакаёвую кватэру, у якую валанцёры завезлі ўсё неабходнае, нават сучасную пральную машыну.

— Мне многае распавядалі пра Беларусь, таму я свядома хацела прыехаць менавіта сюды, — кажа Вольга. — І ніколькі не шкадую. Мне на Жлобіншчыне падабаецца, людзі тут вельмі добрыя.

## «Перад ад'ездам набыла дубовы стол, пра які марыла»

Праз тры дні прыехалі Валера з Таняй і сынам з горада Макееўка Данецкай вобласці. Некалькі дзён яны жылі ў кватэры сям'і Крапіцкіх. Але ўжо ў аўторак пераехалі ў аграгарадок Мормаль. Старшыня мясцовай гаспадаркі згадзіўся ўзяць іх на працу, выдзеліў жыллё.

— Нам не лёгка было адважыцца на такі крок, — кажа Таццяна. — Як і большасць, сядзелі да апошняга, думалі, абыдзецца. Я незадоўга перад ад'ездам набыла на кухню дубовы стол, пра які марыла, шафу-купэ... Ніхто ж не думаў, што так здарыцца... Але калі аэрапорт сталі бамбіць... Ён знаходзіцца ў межах горада, а ў Данецку ж шахты паўсюль. Не дай Бог, трапяць не туды — горад можа ўвесь скласціся, як цацачны домік.

**«Пражылі ў незалежнай Украіне 25 гадоў, ніхто капейкі проста так не даў. Пачалі ўкраінцы ўкраінцаў забіваць — чужыя людзі не даюць памерці».**

— Калі ад'язджалі, — падхоплівае Валера, — па акраінах горада шмат ваеннай тэхнікі стаяла, на ўездах у горад — узброеныя людзі пад украінскім сцягам. А хто пад ім стаіць, цяжка сказаць.

— Я кожны дзень плакала, — узгадвае Таццяна. — Жылі як на парахавой бочцы. Як разбамбілі аэрапорт, я не вытрымала, звязалася па інтэрнэце з Надзяй, пагаварылі па скайпе. На наступны дзень сабралі рэчы першай неабходнасці, дакументы і паехалі на цягніку ў Жлобін...

Віталь Бабін, які вучыўся з Надзеяй Крапіцкай у адным класе, распавёў, што дзяўчына заўсёды ўсім дапамагала. Вельмі любіць жывёл, у яе заўсёды было шмат сабак (і цяпер 6 сабак, дэкаратыўны трусік, двое ваўчанят, кот). Ёй усе насілі параненых варон, а яна іх выходжвала, карміла з піпеткі. Калі выйшла замуж, разам з Алегам марылі выкупіць школу ў прыватніка ў Касакоўцы, каб арганізаваць там прытулак для жывёл. Але, калі даведаліся, колькі ўкраінцаў маюць патрэбу ў дапамозе, вырашылі пачакаць.

— Цяпер наша дапамога больш патрэбна людзям, чым жывёлам, — кажа Надзея Крапіцкая. — У нас у сям'і чацвёра дзяцей, і мы добра разумеем тых маці, якія хацелі б з'ехаць сёння з той часткі Украіны, дзе ідзе вайна. Таму і размясцілі паведамленне ў сацыяльных сетках, на якое адгукнулася вялікая колькасць украінскіх сем'яў.

— Мы адразу растлумачылі, што зможам прыняць у Жлобінскім раёне ад пяці да дзесяці сем'яў, — працягвае Алег. — На большае разлічваць не прыходзіцца, таму што гэтых людзей трэба дзесьці працаўладкаваць і рассяліць, інакш праз 90 дзён іх папросту дэпартуюць. Таму мы гатовы прыняць тут толькі тых, хто сапраўды мае патрэбу ў дапамозе. Перад тым, як прыняць, перапісваліся, стэлефаноўваліся.

— Мы не робім нічога звышнатуральнага. Я і мой муж вырашылі дапамагчы бедным людзям. І такіх сем'яў у Беларусі вельмі шмат. На нашу ініцыятыву адгукнуліся больш як паўтары тысячы сем'яў. Людзі вязуць рэчы нават уначы. У мяне і мужа разрываецца мабільны тэлефон. Але гэта толькі радуе! Людзі перадаюць рэчы і правізію з Гомеля, Светлагорска, Мінска, Добруша, Віцебска, Брэста, Рагачова... У Жлобіне нам дапамагаюць нашы сябры-валанцёры, служба таксі. Мясцовыя ўлады ідуць нам насустрач. Вельмі дапамагае начальнік аддзела міграцыі, старшыні гаспадарак паабяцалі працаўладкаваць усіх украінцаў, якія прыедуць сюды жыць. І нават знайсці для іх якое-небудзь жыллё. Ды і мясцовыя жыхары гатовы прыняць у сябе гэтых людзей на нейкі час.

## «Калі ўбачыла Лену, было такое адчуванне, што я ўзляцела на нябёсы»

Пра сям'ю Крапіцкіх, аказваецца, ведаюць ужо нават у Растове.

— На днях нам патэлефанаваў начальнік аддзела міграцыі і кажа: «Да вас прыехалі», — распавядае Алег Крапіцкі. — Як? Хто? Без папярэджвання? Мы былі ў разгубленасці. Аказалася, што да нас прыехалі яшчэ чацвёра бежанцаў з Украіны. Ім пра нас сказалі ў Растове на вакзале, і ў цягніку нейкая жанчына раіла ехаць у Жлобін.

Мне ўдалося пагаварыць з «нязванымі гасцямі».

Маладую пару з Луганскай вобласці прыняла ў сябе жлобінская сям'я.

— Я сама, калі была ў такім жа ўзросце, як Воля з Багданам, уцякала з Таджыкістана з мужам, — распавядае гаспадыня дома. — Такая ж сітуацыя, вайна.... Пасля бацькоў перавезлі. Цяпер усё добра, ёсць жыллё, праца, дачку нядаўна замуж выдалі. Калі даведалася, што патрэбна дапамога, адгукнулася. Няхай у цеснаце пажывём, але не ў крыўдзе. Думаем цяпер, як дапамагчы маладым людзям з працай. Я працую ў жлобінскім ліцэі. Наколькі ведаю, у нас ёсць вакансія настаўніка французскай мовы. Паспрабую Волю туды ўладкаваць. Ліцэй выдзяляе сваім работнікам інтэрнат. Багдана ж зяць паспрабуе прыстроіць у будаўнічую фірму, дзе сам працуе.

Маладыя людзі, як высветлілася, планавалі ў жніўні справіць вяселле. Цяпер думаюць распісацца ў Беларусі.

Разам з Воляй і Багданам з Луганскай вобласці ўцякалі і бабуля з унучкай.

— Воля вучылася ў інстытуце ў Данецку, — распавядае Таццяна Іванаўна і ледзь стрымлівае слёзы. — Калі горад пачалі бамбіць, яны з хлопцам усё кінулі і прыехалі да бацькоў. Бацька дзяўчыны разам з маёй малодшай дачкой Жэняй стаяць у апалчэнні, добраахвотна ахоўваюць усе 6 дарог, па якіх можна трапіць у пасёлак. У той дзень, калі мы ўцякалі, патэлефанавала Жэня і кажа: «Мама, трэба выратоўваць Леру. Ігар сваю дачку вывозіць. Калі зараз не вывезем Леру, то пасля гэта будзе немагчыма. Мама ўнучкі на рабоце ў гэты час была і не паспела б дабрацца дадому. Ехаць жа трэба было тэрмінова, каб паспець перасячы мяжу да таго, як пачнецца бамбёжка блокпаста. Мой муж, ён інвалід, кажа: «Выратоўвай дзіця. Свет не без добрых людзей, дапамогуць». Дакументы ў нас на мяжы не правяралі. Казакі ведалі, што хутка пачнецца бамбёжка... Толькі падпіхвалі са словамі: «Хутчэй, хутчэй...»

Грошы памяняць бежанцы ў Расіі не змаглі. Заехалі ў тры банкі — ні адзін з іх ні адной грыўні не ўзяў: маўляў, нам забаранілі працаваць з грыўняй з-за вашай вайны. Узяць білеты да Гомеля дапамаглі таксісты...

— У цягніку разгаварыліся з правадніцай. Яна зліталася і прынесла нам цукеркі, булачкі, вафлі. Людзі добрыя не даюць памерці. Пражылі ў незалежнай Украіне 25 гадоў, ніхто капейкі проста так не даў. Пачалі ўкраінцы ўкраінцаў забіваць — чужыя людзі дапамагаюць.

Калі сябры па няшчасці апынуліся ў Жлобіне, адразу рушылі ў міграцыйную службу. У Волі з Багданам праблем з дакументамі няма. А вось у васьмігадовай Леры...

— З дакументаў на ўнучку ў мяне толькі пасведчанне аб нараджэнні, — кажа Таццяна Іванаўна. — Даверанасці мы не змаглі зрабіць, бо ў нас нічога не працуе: ні міліцыя, ні суды, ні пашпартныя сталы, ні пракуратура. Пашанцавала, што нас не правяралі на мяжы. Людзі ж разумелі, што ўцякалі, хто як мог, абы выратавацца. Гаварыла з малодшай дачкой па тэлефоне. Яна сказала, што спрабавалі вывезці Ганну, маму Леры, але блокпост разбамбілі, нікога не выпускаюць. Цяпер я не ведаю, як быць... Няўжо дзіця забяруць у інтэрнат пры жывых маці і бабулі...

Цяпер Таццяна Іванаўна з Лерай жывуць у знаёмых, якіх нейкім неверагодным чынам сустрэлі ў Жлобіне.



Дочкі Вольгі і Дзяніса ўжо паспелі знайсці сабе маленькую сяброўку.

— Мы засмучоныя выйшлі ад начальніка аддзела міграцыі, які сказаў чакаць Алега з Надзяй на калідоры, — распавядае Таццяна Іванаўна. — Лера кажа: «Пайшлі на сонейка». Стаім на ганку, размаўляем. І тут Лера як закрычыць: «Бабуля, глянь!» Праз секунду бачу: яна абдымаецца з некім. У мяне зрок благі... Як бліжэй падышла, убачыла Лену, старэйшую дачку Раісы Іванаўны, якая 10 гадоў таму пераехала з нашага пасёлка ў Беларусь. Але я не ведала, куды канкрэтна. Сувязь не падтрымлівалі... Лена ішла з працы дадому. Калі яе ўбачыла, у мяне было такое адчуванне, што я ўзляцела на нябёсы. «Ленка, цябе Бог паслаў», — кажу. А яна: «Цёця Таня, хоць бы напісалі, патэлефанавалі...»

*За час знаходжання ў Касакоўцы я пагаварыла з вялікай колькасцю валанцёраў. Сярод іх нямала шматдзетных сем'яў. У большасці — сярэдні дастатак. Многія, як маці траіх дзетак Ніна з Рагачова, маюць сваякоў ва Украіне. «Вельмі перажываем за іх. Пішуць, што пакуль быццам ціха, спакойна. Клічу сюды. Сказалі, што будуць чакаць. Яны не хочуць ехаць: да апошняга верацаць, што яшчэ крыху — і ўсё скончыцца. Я вельмі ўдзячна Надзі з Алегам, што яны далі магчымасць нам рэальна дапамагчы замест таго, каб проста глядзець навіны і плакаць».*

*Дай Бог, каб вайна ва Украіне хутчэй скончылася. Страшна падумаць, што адчуваюць людзі, калі чуюць стрэлы, выбухі... А там жа шмат дзетак, цяжарных. І далёка не ўсе, як нашы героі, маюць магчымасць выехаць адтуль... Толькі паспела так падумаць, як у чарговы раз з Надзінага мабільнага раздаецца званок. Малады ўкраінец у разгубленасці. Прыехаў з сям'ёй у Шклоўскі раён. Жонка цяжарная трэцім дзіцем, вось-вось народзіць... «Сказалі, што вы дапамагаеце», — надрыўным голасам хапаецца за апошнюю надзею мужчына...*

*Сумна ад таго, што ў XXI стагоддзі адбываецца ТАКОЕ, што Вялікая Айчынная вайна, якая забрала столькі жыццяў, не навучыла.... Радасна, што застаюцца людзі, для якіх ёсць нешта больш важнае за грошы і асабістыя інтарэсы. Застаецца толькі верыць, што ў простых украінцаў, якія сталі заложнікамі ў братазабойчай вайны, усё складзецца добра.*

**Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.**

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

26 ЧЭРВЕНЯ 2014 г.
ЧАЦВЕР
№ 12 (15747)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


*Імёны*

Віталь КАРПАНАЎ:

## «МНЕ, ЯК І ЎСІМ ЛЮДЗЯМ, БЫВАЕ СУМНА»



**Сёння ён мае ўсё тое, што ў класічным разуменні павінна быць у мужчыны — любімую прафесію, дзіця, дом і нават сад, пасаджаны і названы ў гонар сына. Аднак Віталь Карпанаў на дасягнутым спыняцца не збіраецца. Яго ведаюць як лідара гурта «Дразды», як вядучага на радыё і тэлебачанні. І заўсёды ён усміхаецца, весяліць народ. Пры сустрэчы мы распыталі Віталя пра хвіліны адзіноты, «плюсы-мінусы» публічнасці і кур'ёзы, на якіх можна зарабіць...**

Маё першае пытанне ён апярэджвае сваім — дзе можна будзе ўбачыць артыкул, а потым тлумачыць...

— Бацька сочыць за ўсім, што адбываецца ў маёй творчасці, праз інтэрнэт, тэлефануе сябрам.

**— А калі ў свой час вы вырашылі звязаць сваё жыццё з музыкай, як яны рэагавалі?**

— У прынцыпе, мой выбар іх задавальняў — я ж увесь час займаўся музыкай. Яшчэ маленькім выступаў у клубе. Мабыць, аддаючы мяне ў музычную школу, бацькі не сумняваліся, што потым я выберу нейкі іншы шлях. Хачу верыць, што іх спадзяванні я апраўдаў.

**— У музычнай школе вы вучыліся з братам, аднак ён выбраў прафесію навукоўца. Як складваюцца вашы адносіны?**

— Мой старэйшы брат займаецца навукай, працуе ў Інстытуце аховы раслін. Другая яго сфера дзейнасці — аўтазапчасткі. Мы пайшлі па жыцці рознымі шляхамі, але нашы адносіны з кожным годам толькі паляпшаюцца. Мы адзін аднаму дапамагаем, падтрымліваем. Ён любіць тэхніку, таму па гэтых пытаннях я магу звяртацца да яго. Я ж імкнуся падпітваць брата сваім аптымізмам па жыцці. Можа, і лепш, што мы ў розных плоскасцях, таму што не ўзнікае ніякай канкурэнцыі, непаразуменняў і мы камфортна сябе адчуваем.

**— Да нядаўняга часу вы ігралі на балалайцы. Цяпер яна не гучыць у выступленнях «Драздоў». Няўжо баян таксама хутка замаўчыць?**

— З балалайкай я правёў шмат часу: школа, вучылішча, потым кансерваторыя. Не скажу, быццам быў вялікім балалаечнікам і ў мяне ўсё выдатна атрымлівалася, але эстрада дыктуе свае правілы. У свой час мы зрабілі акцэнт на балалайку, знайшоўшы тым самым цікавую «фішку» і прывабную «фарбу» для нашай групы, «выплылі» на гэтым. Далей жа хочацца развівацца па законах шоу-бізнесу. У некаторых момантах інструмент пачаў мяне абмяжоўваць, а потым атрымалася так, што я на яго сеў — прыйшлося адставіць балалайку ўбок. Цяпер адчуваю, што мне на сцэне і на здымках значна лягчэй без яе. Магу свабодна танцаваць, размаўляць, не адцягваючы ўвагу на выкананне інструментальнай партыі. Яна даўно ўжо проста для іміджу прысутнічала на сцэне. Вось мы і змянілі яго.

А баян у нас з разраду клавішных. Яго гучанне ілюструе «фарбу» народнасці ў нашай музыцы, яна мае важнае значэнне для нас. Таму баян — гэта тэма! Ён не знікне.

**— Дарэчы пра змены. У вашым калектыве з'явіліся дзве бэк-вакалісткі... Чым прывабілі дзяўчат?**

— Мы не пазіцыяніруем іх як бэк-вакалістак. З моманту прыходу ў наш гурт яны выступаюць побач са мной. Спяваюць, танцуюць, ствараюць шоу. І цяпер мы больш выйгрышна глядзімся на розных мерапрыемствах. Нас можна не толькі паслухаць, але і паглядзець! Усе ж любяць і цэняць жаночую прыгажосць.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*Думай сам*

## МЕДЫЯДЖУНГЛІ: ПРАВІЛЫ ВЫЖЫВАННЯ,

### або Адукацыя па-шведску

**...Па перыметры гістарычнага цэнтра шведскага гарадка Кальмар, натужна равучы рухавікамі, кавалькадай, адзін за адным кружылі цяжкія грузавікі, упрыгожаныя бярозавымі галінамі і вясёлымі плакатамі. У грузавіках пад гучную музыку і дудкі танцавалі хлопцы і дзяўчаты ў дзіўных, падобных на марскія, фуражках. Маладыя людзі радасна віталі ўсіх гараджан, што трапляліся па дарозе. Апошнія ўсміхаліся і штосьці крычалі ўслед...**

А незадоўга да гэтага на гарадской плошчы мы таксама назіралі не менш дзіўную для нас карціну. Уся яна была запоўнена людзьмі, якія трымалі над галавой транспаранты. Здалёк падалося, што ў горадзе праходзіць нейкі мітынг. Але наблізіўшыся, мы здагадаліся, што гэта бацькі, у руках якіх... вельмі кранальныя фатаграфіі маленькіх дзяцей, якія ўжо выраслі і сёлета скончылі школу. У многіх былі букеты з жоўтых і блакітных хрызантэм (гэта колеры нацыянальнага флага Швецыі). Як высветлілася, мы трапілі на ўрачыстую частку выпускнога. Слёзы радасці, жарты, смех, малодшыя браты і сёстры ў «групе падтрымкі», выпускнікі на сцэне — усё было як у нас, але адначасова і зусім па-іншаму...

Дарэчы, фуражкі — абавязковы атрыбут усіх выпускнікоў шведскіх гімназій. Гэты галаўны ўбор не перадаюць у спадчыну ад старэйшых да малодшых, хоць, як прызналіся нам бацькі, яго кошт нельга назваць сімвалічным. Як правіла, на фуражках згадваецца навучальная ўстанова і год яе заканчэння. Дзяўчаты апранаюць на свой выпускны белыя ці проста светлыя сукенкі. Плюс зверху і хлопцы, і дзяўчаты накідваюць цёмныя пінжакі.

А пасля ўрачыстай часткі свята выпускнікі ездзяць па горадзе ў адкрытых машынах, упрыгожаных галінамі бярозы. Пажадана, каб гэта была менавіта вялікая машына. Знайсці такія аўто — няпростая задача для маладых людзей. Тым не менш яны з вялікай паспяхова спраўляюцца, бо традыцыі ёсць традыцыі. І ніхто ў горадзе і слова не скажа супраць маладых людзей, якія «крышачку шумяць», бо ўсе лічаць, што выпускнікі маюць на тое права — гэта іх дзень. Бацькі збіраюцца ўвечары ў сваіх кампаніях, каб адзначыць апошняе школьнае свята, а «дзеці» гуляюць па ўласнай праграме. Дарэчы, гімназію ў Швецыі заканчваюць у 18—19 гадоў. Па нашых мерках, даволі позна...

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Адмысловыя фуражкі — абавязковы атрыбут выпускнікоў шведскіх гімназій.



*Увага, аўтары!*

## «МЫ — ТАКІЯ!..» ПЕРАМОЖЦЫ!

### «ЧЗ» падводзіць вынікі конкурсу сярод юных і маладых няштатных аўтараў

**Вось і ўсё. Наш творчы «марафон», які праводзіўся пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і доўжыўся больш за паўгода, падышоў да свайго лагічнага завяршэння. Сёння мы абвесцім пераможцаў і... прадоўжым надалей друкаваць конкурсныя работы. Здзіўлены? Захаваем пакуль інтрыгу. Перш-наперш хацелася б падзяліцца некаторымі цікавымі лічбамі адносна творчага конкурсу і правесці невялікую «работу над памылкамі».**



Фота Любові БЕЛЯЕВАЙ.

**Усяго мы атрымалі больш за 220 «проб пяра» ад юных і маладых няштатных аўтараў з многіх куточкаў нашай краіны.** Назваць дакладную лічбу аўтараў будзе складана. Бо, напрыклад, адну творчую працу пісалі два чалавекі, а іншую — 14 аўтараў! Паўтузіна ўдзельнікаў прыслала па дзве «пробы пяра», некалькі чалавек — па тры. Зноў жа з паўтузіна даслалі ў розны час адну і тую ж працу двойчы — па электроннай пошце або і па ёй, і звычайным лістом. Былі, не здзіўляйцеся, і безымянныя працы. Карацей, увіце, як нам часам было «весела»!

З улікам гэтага нумара на старонках «ЧЗ» **ужо змешчана 57 «проб пяра» нашых юных няштатных аўтараў. Свайго часу чакаюць яшчэ паўтара дзясятка адабраных да друку творчых прац, якія будуць апублікаваны на працягу лета.**

**Мы асабіста пагутарылі больш чым з сотняй абанентаў** — з большасцю юных і маладых удзельнікаў (з некаторымі па некалькі разоў), а яшчэ з іх мамамі (зрэдку з татамі, сёстрамі і братамі), з настаўнікамі, кіраўнікамі гурткоў у школах і цэнтрах творчасці...

**Нам пісалі ўдзельнікі ва ўзросце ад 12 да 18 гадоў.** Калі каго цікавіць, аўтараў-дзяўчынак сярод іх было больш, у тым ліку сёстры-блізняты і проста малодшая і старэйшая сёстры. Забягаючы крыху наперад, адзначым, што сярод пераможцаў конкурсу — таксама толькі дзяўчаты. Калі гаварыць пра гарады, адкуль найбольш актыўна дасылаліся творчыя працы, пералічыць іх усе будзе складана. Гэта Гомель, Лельчыцы, Гродна, Жлобін, Асіповічы, Ваўкавыск, Магілёў, Мазыр, Ліда, Навагрудак, Карма, Наваполацк, Маладзечна (пра тое, як займаюцца юныя журналісты ў гэтым горадзе, чытайце ў матэрыяле ніжэй)... Увогуле, **«геаграфія» дасланых матэрыялаў і разнастайнасць жанраў сведчаць пра тое, як шмат у нашай краіне таленавітай моладзі!..**

Якія тэмы для сваіх «проб пяра» выбіралі нашы юныя няштатныя аўтары? Сімвалічна, правільна і прыемна, што напярэдадні і ў год 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў **многія з іх звярнуліся да тэмы Вялікай Айчыннай вайны** — вельмі моцны след яна пакінула ў гісторыі краіны, у гісторыі літаральна кожнай сям'і... Ад некаторых успамінаў тых, хто перажыў ваенныя ліхалецце, літаральна дрыжыкі ішлі па скуры... Многія аўтары (мы гэта ведаем дакладна) спецыяльна хадзілі на сустрэчы з яшчэ жывымі сведкамі тых падзей, каб занатаваць іх успаміны. Вы зрабілі вельмі добрую і карысную справу!

**Яшчэ пісалі пра славутых землякоў, пра настаўнікаў і кіраўнікоў гурткоў, народных майстроў, пра равеснікаў і іх захапленні...**

Большая частка творчых заявак абрынулася на рэдакцыю літаральна ў апошнія дні, перад заканчэннем іх прыёму. З-за гэтага падвядзенне вынікаў і было перанесена на больш позні час, чым меркавалася першапачаткова. Вы ўяўляеце, якія аб'ёмы інфармацыі трэба было прыняць, раздрукаваць, вычытаць? На жаль, вялікая колькасць дасланых прац не адпавядала ўмовам конкурсу.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
26 06 2014 г.

# МЕДЫЯДЖУНГЛІ: ПРАВІЛЫ ВЫЖЫВАННЯ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

## ШКОЛЬНЫ АТЭСТАТ + ПРАФЕСІЯ

У горадзе Кальмар з насельніцтвам крыху больш як 60 тысяч чалавек дзейнічаюць чатыры гімназіі. Гімназія — гэта, так бы мовіць, старшая ступень школы. Абавязковая адукацыя ў Швецыі — дзевяцігадовая, але каля 95% падлеткаў не спыняюцца на дзевяці класах і, у залежнасці ад сваіх інтарэсаў і схільнасцяў, выбіраюць для далейшага навучання той ці іншы профіль гімназіі — усяго прапануюцца шаснаццаць кірункаў. Усе праграмы складаюцца з пэўнай колькасці курсаў. Некаторыя курсы, такія, як англійская мова, з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх кірункаў. З шаснаццаці праграм чатырнаццаць арыентаваны на атрыманне розных прафесій, а дзве (тэарэтычныя) скіраваны выключна на працяг навучання ў ВНУ. За патэнцыяльных гімназістаў разгортваецца барацьба. Гімназіі праводзяць рэкламныя кампаніі, каб прыцягнуць да сябе найбольшую колькасць студэнтаў (менавіта так называюць у Швецыі вучняў гімназій). Дарэчы, школьная адукацыя ў Швецыі — бясплатная, хоць у краіне дзейнічае таксама і сетка прыватных школ. Праграма гімназіі разлічана на тры гады. Праўда, выбар таго ці іншага профілю зусім не азначае, што выпускнік абавязкова стане журналістам ці кулінарам. Напрыклад, адзін з трох профіляў гімназіі, якую мы наведалі, — гэта медыя. Але на факультэт журналістыкі паступаюць нямногія з яе выпускнікоў. І педагогі ад гэтага зусім не засмучаюцца, бо ўпэўнены, што веды, атрыманыя іх вучнямі, будуць вельмі карысныя ў далейшым самастойным жыцці.

**ЦІКАВА ВЕДАЦЬ:**

***У 2012 годзе ранейшая сістэма ацэнак «залік» (G), «залік з адзнакай» (VG), «залік з асаблівай адзнакай» (MVG) і «незалік» (IG) была заменена ў Швецыі новай шкалой з шасцю адзнакамі ад A да F. Адзнакі ад A да E з'яўляюцца прахаднымі, а F — непрахадны бал. Але да шостага класа ацэнкі вучням у шведскіх школах увогуле не выстаўляюцца.***

## У ПАЛОНЕ МЕДЫЯ

Але профільнасць старшай школы — не адзіная адметнасць шведскай сістэмы адукацыі. У Швецыі шмат гадоў паспяхова рэалізуецца праграма медыяпісьменнасці: медыяадукацыя афіцыйна інтэгравана ў нацыянальны вучэбны план.



Петэр ДАЛЕН дзеліцца сакрэтамі стварэння медыяпрадуктаў.

Безумоўна, само паняцце «медыя» — надзвычай шырокае. Медыясвет — гэта кнігі і фільмы, часопісы і газеты, радыё і тэлебачанне, рэклама і відэагульні, музыка і білборды, інтэрнэт і сацыяльныя сеткі. Швецыя мае самы высокі ў Еўрапейскім саюзе ўзровень пранікнення інтэрнэту, і сацыяльныя медыя сталі неад'емнай часткай жыцця большасці шведаў. У краіне пражывае толькі 9,6 млн чалавек, аднак у «Твітары» зарэгістраваны каля 100 тысяч карыстальнікаў са Швецыі, а больш як 3 мільёны з'яўляюцца карыстальнікамі «Фэйсбука». Многія маладыя шведы таксама з'яўляюцца актыўнымі блогерамі.

Падлічана, што шведы ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў знаходзяцца пад уплывам медыя ў сярэднім 7 гадзін штодня. 80% падлеткаў і маладых людзей у краіне маюць смартфоны, якія яны выкарыстоўваюць для самых розных мэт: ад чытання навін і стасункаў у сацыяльных сетках да гульняў. Кожны з пяці хлопчыкаў і кожная з 20 дзяўчынак праводзяць за відэагульнямі тры і больш гадзін штодня. Больш за тое, сёння можна знаходзіцца пад уплывам адразу некалькіх медыя: сядзець у камп'ютары, глядзець паралельна праграму па тэлебачанні, слухаць па радыё навіны ці музыку, балбатаць па мабільным тэлефоне або па скайпе, гартаць часопіс з рэкламай ...

Каб абараніць дзяцей ад шкоднага ўздзеяння медыя, іх вучаць у школе адсейваць і аналізаваць медыяпаведамленні, развіваюць у вучняў назіральнасць і крытычнае мысленне. І не толькі....

## САКРЭТНАЯ «КУХНЯ»

Напрыклад, вучні гімназічнага медыякласа атрымліваюць такія заданні: прачытаць кнігу класіка і зняць на падставе прачытанага відэаролік пра сваё бачанне твора, напісаць газетны артыкул пра любімага мастака, аформіць вокладку каляровага часопіса, стварыць мультфільм, напісаць паведамленне пра альтэрнатыўныя крыніцы энергіі або глабальнае пацяпленне... Педагогі ўпэўнены: калі зняць фільм на падставе кнігі, то кніга зусім інакш запомніцца падлетку...

— Першы год навучання ў нас выкладаюцца асновы медыя. А на працягу другога года ўжо амаль палову ўсяго вучэбнага часу вучні самі займаюцца стварэннем медыяпрадуктаў, — расказвае **выкладчык гімназіі Петэр ДАЛЕН.** — Ва ўсіх навучэнцаў ёсць лэптопы, на якіх яны працуюць. Дзеці вучацца распавядаць пры дапамозе малюнкаў і выяў, вучацца самі пісаць і ілюстраваць тэксты. Мы робім упор на развіццё ў нашых вучняў мультымагчымасцяў таму, што лічым: універсальны журналіст павінен умець напісаць тэкст, зрабіць фотаздымкі, зняць відэа, зрабіць радыёрэпартаж — усе гэтыя ўменні і навыкі значна спрашчаюць пошукі работы.

Наша адрозненне ад іншых школ заключаецца ў тым, што мы імкнёмся інтэграваць медыя ва ўсе іншыя прадметы. Так, курс «Грамадазнаўства» ў нас выкладаюць два выкладчыкі: адзін адказвае за грамадазнаўчы кірунак, а другі — за медыякірунак. На іх уроках вучні вывучаюць законы і правілы, па якіх жывуць медыя, даведваюцца, як медыя ўплываюць на грамадства і наадварот. Або, напрыклад, на ўроку англійскай мовы вучні атрымліваюць заданне падрыхтаваць прэзентацыю Лондана, і мы разам з імі ствараем на гэтую тэму невялічкі мультфільм пры дапамозе лічбавай тэхнікі. А на ўроку шведскай мовы, напрыклад, настаўнік дае заданне напісаць артыкул на складаную тэму. Мы можам аформіць яго ў выглядзе дэбатаў — так, як гэта робіцца ў буйных газетах. Шмат часу прысвячаем збору інфармацыі, ніколі не пачынаем выкананне задання з чыстага ліста. Напрыклад, калі педагог даручае аформіць вокладку часопіса, то студэнты абавязкова вывучаюць, як гэтае пытанне вырашаецца ў розных СМІ. Натуральна, што мы вывучаем і тэорыю: як тыя ці іншыя колеры ўплываць на наша ўспрыманне і многія іншыя сакрэты стварэння медыя.

**ТЭСТ НА АДПАВЕДНАСЦЬ УНІВЕРСІТЭЦКАМУ ЎЗРОЎНЮ**

***У Швецыі паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы можна, маючы на руках атэстат аб заканчэнні гімназіі або муніцыпальнай школы для дарослых, дзе даецца магчымасць падцягнуць патрэбныя прадметы, каб затым паступіць у ВНУ. Заяву аб прыёме ў ВНУ можна падаць таксама, здаўшы тэст на здольнасці да навучання, які вызначае наяўнасць у абітурыента ведаў і навыкаў рознага кшталту. Вынікі тэста паказваюць, наколькі добра абітурыент падрыхтаваны да навучання на ўніверсітэцкім узроўні. Тэст не выключае патрабаванне мець атэстат аб завершанай сярэдняй адукацыі, але абітурыент мае права ўдзельнічаць у конкурсе на падставе вынікаў тэста, а не ацэнак у атэстаце. Калі месцаў ва ўніверсітэце менш, чым ахвотных, то прымаюць тых, у каго больш высокі бал. На прэстыжныя кірункі, такія як інфарматыка, шанцы паступіць маюць толькі выдатнікі. Свае шанцы на паступленне можна павысіць і за кошт балаў, якія залічваюцца абітурыенту звыш атэстата, калі той прайшоў у гімназіі нейкія «прасунутыя» курсы — напрыклад, па матэматыцы або замежнай мове.***

За мінулы год гімназісты знялі каля 200 відэаролікаў. На іх прагляд абавязкова запрашаюцца староннія гледачы, бо педагогі лічаць: тое, што ствараюць гімназісты, не павінна заставацца толькі ў сценах гімназіі.

Летась тэмай экзаменацыйнай работы выпускнікоў былі гендарныя праблемы, а ў гэтым годзе — пытанні несправядлівасці ў грамадстве. Тэму можна раскрываць пры дапамозе графічных выяў, відэа, фатаграфіі і г.д. Увогуле ў гімназіі вельмі любяць эксперыментаваць. Педагагічнае крэда — правільных і няправільных рашэнняў не існуе. Трэба даць вучням магчымасць «правaліцца» і пацярпець няўдачу.

— Дзіўна было б выстаўляць ацэнкі за крэатыўнасць, — падкрэслівае Петэр. — Мы ацэньваем развіццё вучня і яго жаданне працаваць. Вырасціць будучых журналістаў — не галоўная мэта. Наша задача — навучыць маладых людзей крытычнаму ўспрыманню медыя, у тым ліку і праз стварэнне ўласных медыяпрадуктаў.

Петэр — педагог з журналісцкай адукацыяй — займаецца выкладаннем ужо 12 гадоў. Ён упэўнены, што свет медыя развіваецца куды больш імкліва, чым ствараюцца падручнікі. Таму ў гімназіі самі распрацоўваюць вучэбныя праграмы. Увогуле кожная школа ў Швецыі можа трактаваць медыяадукацыйны спектр вучэбнага плана па-свойму.

**ШКОЛА — САМАЕ БЯСПЕЧНАЕ МЕСЦА**

***У 2006 годзе Швецыя прызначыла першага прадстаўніка па справах дзяцей і навучэнцаў, які абавязаны распаўсюджваць інфармацыю пра закон аб дыскрымінацыі, дапамагаць школам папярэджваць цкаванне адных вучняў іншымі, сачыць за дзейнасцю школ у гэтым кірунку і быць прадстаўніком навучэнцаў, якія пацярпелі ад цкавання.***

***Паводле міжнароднага даследавання TIMSS, у Швецыі самы высокі працэнт дзяцей, якія адчуваюць сябе ў бяспецы, знаходзячыся ў школе. 95% вучняў старшай школы і старшых класаў абавязковай школы сцвярджаюць, што заўсёды або ў большасці выпадкаў адчуваюць сябе ў бяспецы, калі знаходзяцца ў школе.***

## ВЫХАВАННЕ ЧЫТАЧОЎ

Асобнай увагі заслугоўвае праект «Медыякомпас», які рэалізуе ў гімназіях медыякансультант і педагог Ёран Андэрсан. Адзін з кірункаў яго работы — вядзенне вэб-старонкі ў інтэрнэце, дзе Ёран выкладае спіс тэм, якія, на яго думку, было б цікава абмеркаваць на школьных занятках. Таксама размяшчаецца матэрыял пра тое, што сёння адбываецца ў свеце з магчымасцю паўдзельнічаць у невялікай віктарыне, якая стымулюе падлеткаў сачыць за падзеямі ў свеце. Кожны панядзелак Ёран адпраўляе ўсім настаўнікам, што выкладаюць у гімназіях грамадазнаўства і шведскую мову, ліст, які падказвае найбольш важныя тэмы.




Асобная падзея — правядзенне ў гімназіях медыядзён, калі Ёран збірае ў актавай зале адначасова 300-400 вучняў і расказвае падлеткам пра заканадаўства, якое дазваляе шведскім грамадзянам атрымліваць доступ да любой інфармацыі і сачыць за дзеяннямі ўлады. Паказвае на рэальных прыкладах, як працуюць законы, і ў першую чаргу закон аб свабодзе друку.

— Хуткасць перадачы інфармацыі змяніла твар медыя. І для нас гэта праблема, паколькі тыя здымкі і тэксты, якія ніколі б не з'явіліся ў газетах, цяпер распаўсюджваюцца імгненна ў сацыяльных сетках, — канстатуе Ёран Андэрсан. — Калі, напрыклад, адбылося забойства, то газеты паведамяць толькі пра гэты факт, а ў сацыяльных сетках можна будзе знайсці і прозвішча забойцы, і нават яго фатаграфію.

У 2011 годзе ў Швецыі быў прыняты новы план навучання, паводле якога школа павінна вучыць падрастаючае пакаленне крытычнаму і аналітычнаму мысленню. Гэта самая галоўная задача — навучыць крытычна ставіцца да той інфармацыі, якая захліствае ўсіх нас на кожным кроку, навучыць маладых людзей арыентавацца ў інфармацыйных патоках. Я сустракаюся з гімназістамі для таго, каб патлумачыць ім, якія правілы і законы ўплываюць на работу журналістаў, па якіх законах жывуць медыя, і тым самым зрабіць з іх найбольш крытычна ўзброеных маладых людзей, якія ведаюць, як ім рэагаваць на тое, што публікуецца. Звычайна пачынаю нашу сустрэчу са сваёй прэзентацыі. Затым перад гімназістамі выступаюць прэсамбудсмен Швецыі і супрацоўніца газеты «Барометр», якая тлумачыць, якіх этычных правілаў трэба прытрымлівацца, калі размяшчаеш штосьці ў сацыяльных сетках, і якія могуць быць наступствы бяздумных паводзін. Мы разбіраем з маладымі людзьмі складаныя выпадкі, калі, напрыклад, журналісты газеты знаходзіліся перад маральнай дылемай — публікаваць або не публікаваць той ці іншы тэкст.

**КАНІКУЛЯРНЫ ГРАФІК**

***Летнія канікулы доўжацца ў Швецыі 10 тыдняў і пачынаюцца ў сярэдзіне чэрвеня. Зноў у школу вучні ідуць у сярэдзіне жніўня. Вучэбны год падзелены на два семестры з канікуламі пасярэдзіне. Напрыканцы кастрычніка — у пачатку лістапада ў школьнікаў тыднёвыя канікулы. На Каляды вучоба заканчваецца 24 снежня, і вясенні семестр распачынаецца толькі ў пачатку студзеня. Напрыканцы лютага або ў пачатку сакавіка ў вучэбным графіку таксама запланаваны тыднёвыя канікулы для заняткаў зімовымі відамі спорту. Многія сем'і адпраўляюцца ў гэты час у горы на поўначы краіны, каб пакатацца на лыжах і снаўбордах.***

Ёран Андэрсан канстатуе, што 10 гадоў таму ў яго было 20 калег па ўсёй Швецыі, якія таксама працавалі са школьнікамі, але эканамічная сітуацыя газет пагоршылася, і медыякансультанты сталі ахвярай вымушанай эканоміі.

Сёння работу Ёрана ў складчыну аплачваюць 50 выдаўцоў, якія лічаць, што трэба выхоўваюць крытычна настроеных чытачоў. Ёран спадзяецца, што з цягам часу да іх далучацца і іншыя выдаўцы:

— Сёння падрастае вялікая колькасць журналістаў-аматараў, незнаёмых з якаснай журналістыкай, і я мяркую, што веды, якія мы распаўсюджваем у школах, вельмі важныя і карысныя для ўсіх. Мы дапамагаем фарміраваць актыўную пазіцыю для таго, каб маладыя людзі ўпэўнена адчувалі сябе ў сучаснай інфармацыйнай прасторы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота аўтара.**
*Мінск—Стакгольм—Кальмар—Мінск.*

Выпускнікі ў кузавах грузавікоў — шведская традыцыя.



# «МЫ — ТАКІЯ!..» ПЕРАМОЖЦЫ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Па-першае, мова. **Да ўдзелу ў конкурсе прымаліся толькі «пробы пяра» на роднай мове.** Гэтае патрабаванне вынікае з самой сутнасці існавання «Чырвонкі. Чырвонай змены», якая зарэгістравана як маладзёжны дадатак на беларускай мове. Заўважыўшы праз некалькі месяцаў, што паступае даволі вялікі працэнт творчых прац на рускай мове, мы са старонак «ЧЗ» нагадвалі аўтарам пра неадпаведнасць умовам конкурсу, але, як высветлілася, дарэмна...

Па-другое, першапачаткова **конкурс «Мы — такія!..» задумваўся і абвяшчаўся для тых хлопцаў і дзяўчат, якія пішуць на беларускай мове і жадаюць у будучым атрымаць прафесію журналіста.** І хаця ніякіх узроставых абмежаванняў мы не ставілі, было зразумела, што ён разлічаны найперш на вучняў старшых класаў. Таму і планка ў яго, прызнаем, была некалькі «завышанай». Гэта **не конкурс школьных сачыненняў, рэфератаў і насценных газет.** Мы чакалі найперш «проб пяра» ад тых, хто хоча паспрабаваць менавіта «журналісцкага хлеба» (гэта значыць паспрабаваць напісаць інтэрв'ю, рэпартаж, нататку), а атрымлівалі... вершы, байкі, прыпавесці... Журналісцкі матэрыял як мінімум павінен мець уласны загаловак. «Мы — такія!..» — назва ўсяго конкурсу, але ж рэдакцыя атрымала некалькі дзясяткаў работ менавіта з такой «назвай».

Па-трэцяе, **сапраўды шмат праблем прынёс тэхнічны бок.** Нягледзячы на пералічаныя ўмовы да творчых прац, у большасці выпадкаў не пазначаўся або нумар пашпарта, або асабісты нумар, або дата выдачы дакумента. Часам адсутнічаў хатні адрас або менавіта гэтая інфармацыя была ці на рускай, ці на беларускай (а нам патрэбна была на дзвюх мовах: мы ж не ведаем, дзе трэба ставіць націск у прозвішчы). Не заўсёды былі пазначаны кантактныя тэлефоны саміх аўтараў, каб можна было аператыўна выправіць сітуацыю. **Мы маглі не разглядаць такія працы,** але было шкада дзяцей, якія прыкладалі намаганні, рыхтуючы іх. Тут ужо, падаецца, быў недагляд з боку дарослых. Самі работы часта дасылаліся, афармленыя як школьныя рэфераты, з завярстанымі ў іх фатаграфіямі (часта іх якасць вымушала чакаць лепшага). На выпраўленне ўсіх гэтых хібаў ішло вельмі шмат часу: быццам бы дробязь, але ўлічыце колькасць дасланых творчых заявак...

Па-чацвёртае, **тэмы многіх работ, дакладней, тое, як яны былі раскрыты (ці, хутчэй, наадварот)...** Мы вельмі прасілі не пісаць нейкіх агульнавядомых рэчаў, узятых з адкрытых крыніц. Недастаткова проста перапісаць гісторыю свайго населенага пункта або біяграфію славутага земляка, дадаўшы да гэтага словы ўласнага захаплення. Такую інфармацыю ў разумных межах можна і трэба выкарыстоўваць, калі гэта абумоўлена кантэкстам. Але павінна быць тое, што, як мы ўжо гаварылі, адрознівае журналісцкі матэрыял ад школьнага рэферата. У кожным выпадку гэта свая цікавінка (форма падачы, патрэбная інтанацыя), і многія аўтары яе змаглі знайсці. Але сум браў, калі даводзілася чытаць 60-ю ці 70-ю па ліку працу, якая пачыналася аднолькавымі агульнымі словамі кшталту «старэйшае пакаленне сцвярджае, што моладзь ужо не такая...» А яна сапраўды не такая і не павінна быць такой, як была некалі раней! Многім аўтарам удалося раскрыць гэтую тэму, звярнуўшыся да канкрэтных прадстаўнікоў моладзі — сваіх равеснікаў, і расказаць, як яны ўмеюць сябраваць, якія незвычайныя захапленні маюць!

**А цяпер надышоў час назваць імёны пераможцаў нашага творчага конкурсу! Увага! Імі па рашэнні рэдакцыйнага журы становяцца...**

Ганна ФІЛІСТОВІЧ, вучаніца 11 класа гімназіі № 10 г. Маладзечна — за матэрыял «Марк Войтка: «Я са сцэны — ні нагой!», які быў апублікаваны ў «ЧЗ» 27.03.2014 г.

Юлія КЕДЭЛЬ, вучаніца 7 класа СШ № 3 імя В.М. Усава г. Гродна — за матэрыял «Вінцік з вачамі колеру свежай травы» (змешчаны 24.04.2014 г.).

Лізавета КАРПОВІЧ, вучаніца 10 класа Ліцэя БДУ за творчую працу «Выпрабаваць сябе... Антарктыдай» (29.05.2014 г.).

Наталля БЫХАН, вучаніца 9 класа Майсееўскага дзіцячага сада — сярэдняй школы Акцябрскага раёна за «пробу пяра» пад назвай «Мы — рэха...» (29.05.2014 г.).

Кацярына ГРЫНЬКО, вучаніца 9 класа гімназіі № 3 г. Магілёва — за матэрыял «Боль у сінім сшытку», які будзе надрукаваны ў адным з бліжэйшых нумароў «Чырвонкі».

Аліна АНДРЭЕНКА, вучаніца 9 класа гімназіі № 58 г. Гомеля імя Ф.П. Гааза за творчую працу «Дзе схавана нітка-невідзімка?», якая друкуецца сёння на 4-й старонцы.

**Усе яны атрымаюць ад рэдакцыі дыпломы пераможцаў і памятныя прызы з сімволікай «Выдавецкага дома «Звязда».** Ганна Філістовіч таксама атрымае рэкамендацыю для паступлення ў Інстытут журналістыкі БДУ.

**Лаўрэатамі конкурсу становяцца:**

Надзея ГАЎРЫЛЕНКА, вучаніца 11 класа СШ № 6 г. Жодзіна (за матэрыял «Веры і дабрыні нашым сэрцам», «ЧЗ» ад 16.01.2014 г.), Яніна МІНЕНКА, вучаніца 11 класа Лельчыцкай СШ № 1 («Мы — мабільныя, крэатыўныя, творчыя!», 13.02.2014 г.), Аліна БУЦЬКО, вучаніца 11 класа Тонежскага дзіцячага сада — сярэдняй школы Лельчыцкага раёна («Тонеж мой, старонка дарагая!..», 27.02.2014 г.), Юлія БАЯРСКІХ, вучаніца 9 класа Трасцянецкай СШ Мінскага раёна («Зайчык-выратавальнік», 27.02.2014 г.), Іна БУШЫЛА, вучаніца 11 класа СШ № 1 г. Ляхавічы («Гісторыя маёй сям'і», 24.04.2014), Надзея ЛАЗАРЧЫК, вучаніца 8 класа навучальна-педагагічнага комплексу «Старадварэцкія яслі-сад — базавая школа Бераставіцкага раёна («Любові нязгаснае святло», 24.04.2014 г.), Яніна МІХНАВЕЦ, вучаніца 11 класа Мілевіцкага дзіцячага сад — сярэдняй школы Жыткавіцкага раёна («Жывём і памятаем...», 15.05.2014 г.), Вера КАНОПСКАЯ, вучаніца 10 класа гімназіі № 7 г. Маладзечна («Пад маскай разгледзець анёла», 15.05.2014 г.), Вікторыя ПАЖЫГАЙЛА, вучаніца 9 класа СШ № 11 г. Маладзечна («Сапраўдны рыцар!», 15.05.02014 г.), Марына КУРАЕДАВА, вучаніца 11 класа Сасноўскага дзіцячага сада — сярэдняй школы Віцебскага раёна («Не грашыце, людцы, Богу»..., 29.05.2014 г.), Вольга БЯНЧУК і Ганна КАЗАМЕЛЬ, вучаніцы 10 класа Рэчыцкай раённай гімназіі («Каб ралет з рынку не дыктаваў моду», 12.06.2014 г.), Вікторыя ПРЫГОЦКАЯ, вучаніца 11 класа СШ № 3 г. Ашмяны («Усмешка, што ледзь кранае вусны...», гэты матэрыял будзе апублікаваны ў адным з бліжэйшых нумароў «Чырвонкі»), Марыя ІВАНЮК, вучаніца 9 класа Дабравольскага дзіцячага сада — сярэдняй школы Свіслацкага раёна, (яе матэрыял «Сум блакітных вачэй» друкуецца сёння на 5-й старонцы).

**Усе вышэйпералічаныя аўтары будуць узнагароджаны дыпломамі лаўрэатаў конкурсу і памятнымі прызамі.** Старэйшыя дзяўчаты — Іна Бушыла і Вікторыя Прыгоцкая — апроч таго, атрымаюць рэкамендацыі для паступлення ў Інстытут журналістыкі БДУ. **І пераможцам, і лаўрэатам конкурсу, якія збіраюцца паступаць сёлета, мы пастараемся даслаць найперш дыпломы і рэкамендацыі, каб паспець да заканчэння тэрмінаў прыёму дакументаў у прыёмных камісіях ВНУ. А пасля ўручым памятныя прызы.**

Напрыканцы хацелася б сказаць тое, што мы ўжо неадночы паўтаралі са старонак «ЧЗ»: прайграўшых у гэтым конкурсе няма! Нават тыя, хто не перамог сёлета, атрымалі пэўны досвед, паспрабавалі свае сілы. Хтосьці дзякуючы конкурсу пакаштаваў таго самага «журналісцкага хлеба», смак якога, упэўнена, ім спадабаўся, а значыць, у перспектыве мы можам сустрэцца з гэтымі аўтарамі — ужо як з калегамі па нашым цэху, па рэдакцыі. Апублікаваныя працы ляглі ў «скарбонку» будучай падрыхтоўкі да паступлення на журфак. Камусьці, верым, удасца ажыццявіць гэтую мару ўжо сёлета.

Усіх яшчэ раз віншуем! І хочам сказаць вось што. Калі ёсць імкненне, пішыце ў «Чырвонку. Чырвоную змену», не чакаючы абвяшчэння чарговага конкурсу. Дарэчы, каб пачытаць астатнія работы пераможцаў, вы яшчэ паспяваеце падпісацца на ІІІ квартал на «Звязду» з маладзёжным дадаткам «Чырвонка. Чырвоная змена». Лета — цудоўная пара падзяліцца сваімі ўражаннямі ад новых сустрэч і здабыткаў. Чакаем вашых матэрыялаў!

**Рэдакцыя «ЧЗ».**

*Дарогу маладым*

# «МАЛАДЗІК»: нашы людзі ёсць паўсюль!




**Амаль 14 гадоў у Маладзечне існуе свой «журфак»: а як іначай называць клуб юных журналістаў «Маладзік», многія выхадцы з якога ўжо зрабілі імя ў прафесіі? «Маладзікоўцы» — актыўныя аўтары беларускай прэсы. Іх публікацыі неаднойчы з'яўляліся і на старонках нашай «Чырвонкі». У маі «стукнула» 10 гадоў газеце «Маладзік» — аднаму з лепшых маладзёжных выданняў Беларусі. Нягледзячы на канікулы, на носе — тры конкурсы, у якіх збіраюцца паўдзельнічаць маладыя журналісты. Дарэчы, дыпломаў і ўзнагарод у «Маладзіка» сабралася багата — самыя-самыя ўпрыгожваюць сцены кабінета... «Гэта яшчэ не ўсе, — кажа заснавальніца і кіраўнік клуба Наталля ШУЛЬЖЫЦКАЯ, да якой мы завіталі ў госці. — Астатнія ляжаць у папках. Сёлета ўзялі 19 абласных дыпломаў і 5 рэспубліканскіх — куды ж усе вывесіш?»**

***— Наталля Віктараўна, раскажыце, што асабіста вас прывяло ў журналістыку?***

— У дзяцінстве я была актыўнай дзяўчынкай, пісала вершы і дасылала ў газету «Зорька». У сёмым класе прыняла ўдзел у міжнародным конкурсе на лепшую заметку пра лета і стала пераможцай. Гэты маленькі эпізод з майго жыцця, які на выбар прафесіі не паўплываў. Прызнаюся, у часы маёй маладосці прафесія журналіста была чымсьці завоблачным, нерэальным, недасягальным — туды ішлі толькі лепшыя і творчыя. Я самакрытычна ацаніла свае магчымасці і ўменні ды пайшла ў педагогі.

Калі прыйшла ў маладзечанскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі працаваць метадыстам, мне прапанавалі весці які-небудзь гурток. І я задумалася пра журналістыку — існавала такая патрэба, бо ў школах нічога падобнага не было. Да таго ж мы хацелі распавядаць пра работу нашага цэнтра, але вуснамі не дарослых, а дзяцей. Назву «Маладзік» прыдумалі спачатку для гуртка, пасля яна стала «іменем» і для цэнтра. Яна сімвалізуе маладосць і энергію. Цяпер «Маладзік» стаў брэндам Маладзечна.

***— Ці многія з вашых выхаванцаў сталі вядомымі асобамі?***

— Трыццаць вучняў паступілі ў ВНУ на спецыяльнасць «Журналістыка», некалькі чалавек вучацца ў Літве, яшчэ адна дзяўчынка атрымлівае адукацыю ў Санкт-Пецярбургу. Напэўна, самыя вядомыя — гэта тыя, каго мы бачым штодня па тэлебачанні: спартыўны карэспандэнт Павел Капуцкі, карэспандэнт Наталля Кезік, вядучая Кацярына Шыбко. На беларускім радыё — вядучая рубрыкі «Адкрытая пляцоўка» Вікторыя Дубаневіч. Працуюць мае выпускнікі і ў раённых, абласных газетах. Магу сказаць «па сакрэце»: паўсюль ёсць «нашы людзі».

**Назву «Маладзік» прыдумалі спачатку для гуртка, пасля яна стала «іменем» і для цэнтра. Яна сімвалізуе маладосць і энергію. Цяпер «Маладзік» стаў брэндам Маладзечна.**



**Выхаванка клуба дзесяцікласніца Карына КІСЕЛЬ на індывідуальным занятку ў Наталлі ШУЛЬЖЫЦКАЙ.**

***— Цікава, як вы працуеце ў групе: усе разам — над адным матэрыялам?***

— Сама група невялікая, прыкладна 10-12 чалавек, і раней мы працавалі ў камандзе. Аднак два гады таму зацвердзілі Кодэкс РБ аб адукацыі, які дазволіў праводзіць індывідуальныя заняткі. Я распрацавала праграму і цяпер працую з кожным гурткоўцам паасобку — дзве гадзіны ў тыдзень на чалавека. Гэта больш эфектыўная практычная работа над публікацыямі.

***— Звычайна гурткоўцы выбіраюць адну тэму ці хапаюцца за ўсе адразу?***

— Рэдка так здараецца, што дзеці працуюць у адным кірунку. Праўда, калі да нас прыйшоў Павел Капуцкі, ён адразу сказаў: «Я пішу пра спорт і — кропка». Найчасцей мы робім інфармацыйныя заметкі і рэпартажы пра падзеі і мерапрыемствы. Другі кірунак — эсэ, інтэрв'ю, замалёўкі з цікавымі людзьмі, якіх дзеці шукаюць самі.

***— Будучы журналіст павінен або пісаць тэкст, або рабіць фотаздымкі?***

— У прафесіянальнай журналістыцы, магчыма, такі падзел працы апраўданы. Але ўсе нашы юныя журналісты-ўніверсалы: пішуць, фатаграфуюць, здымаюць на відэа. Мне падаецца, калі журналіст умее рабіць усё — выдатна, бо здараюцца выпадкі, калі не заўжды пад рукой будзе фатограф-прафесіянал, а здымкі зрабіць трэба.

***— Ці ёсць постаці, на якіх вы раўняецеся?***

— Куды ж без гэтага! Напрыклад, Павел Лазовік, які працуе на беларускім радыё, а апошнім часам мы яго бачым і на тэлебачанні. Родам ён з Маладзечна, быў у нас у гасцях і праводзіў творчую сустрэчу, даваў парады, каментарыі. Усе проста ў захапленні ад Паўла і як ад прафесіянала, і як ад асобы. Для юнкараў ён з'яўляецца сапраўдным прыкладам. Акрамя таго, ёсць чаму павучыцца і ў мясцовых маладзечанскіх журналістаў.

***— Калі дзеці кідаюць заняткі, то па якіх прычынах?***

— Многія разумеюць, што журналістыка — цяжкая праца. Пасля сямі ўрокаў у школе прыходзіць і займацца тым жа відам інтэлектуальнай дзейнасці — надзвычай вялікая нагрузка. Бывае, што ў дзяцей ёсць жаданне, але ў іх усё распісана і часу не застаецца. Тым не менш, асновы журналістыкі — гэта і хобі, бо першапачатковай мэтай гуртка была арганізацыя вольнага часу моладзі, развіццё іх творчых здольнасцяў. Аднак, калі нашы навучэнцы адзін за адным пачалі паступаць у ВНУ, на першы план выйшла прафарыентацыя.

Мне падаецца, быць прафесіяналам у журналістыцы — вельмі складана. Асновам — напісанню загалоўка, пошуку і распрацоўцы тэмы — навучыць можна. Але ўсё ж павінна быць у чалавеку закладзена журналісцкая жылка, дадзенае ад прыроды пачуццё стылю — без гэтага сапраўдны журналіст не сфарміруецца.

**Кацярына РАДЗЮК.**
**Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.**
*Мінск—Маладзечна—Мінск.*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
26 06 2014 г.

Мы — такія!

# УКРАДЗЕНАЕ ДЗЯЦІНСТВА

**Вайна... Самае жудаснае — вайна. Самае немагчымае — вайна. Калі мы вымаўляем гэтае слова, сэрца сціскаецца ад крыўды і болю. Колькі праліта слёз, колькі скалечана лёсаў! Як жа хораша, што мы жывём у мірнай і спакойнай краіне. Што не прачынаемся ад снарадаў і не бачым той жах, які паглынуў наш свет у чэрвені 1941 года. Мне пашчасціла пазнаёміцца з жанчынай, якая распавяла пра тое, як яна ў гады Вялікай Айчыннай вайны трапіла разам з бацькамі ў нямецкі працоўны лагер Флосенбюрг.**

### ПРА АЎТАРА

*Маргарыта Навуменка, наш 15-гадовы аўтар, любіць з карысцю праводзіць свой адпачынак. Некалькі гадоў ходзіць у студыю «Палітра», дзе можна забыцца пра ўсе бытавыя праблемы і цалкам пагрузіцца ў творчасць. Захапляецца танцамі. Асабліва любімы занятак — фатаграфаванне.*

*— Нядаўна вызначылася з выбарам будучай прафесіі. Хачу паступіць у БДУ на факультэт аўдыявізуальнай журналістыкі. Таму развіваю навык пісьма, з педагогам па рыторыцы і іншымі школьнікамі вырашылі стварыць сваю газету, — распавяла Маргарыта. — Бо вельмі цікава даведацца пра нешта новае ў самой школе ад сваіх жа сяброў і аднакласнікаў. Таксама хачу ў будучыні паспрабаваць сябе ў ролі вядучай навін. Я вельмі жвавы чалавек і менавіта ў прафесіі журналіста бачу сваю будучыню.*

Надзея Фядотаўна Гошка нарадзілася ў вёсцы Майсееўка ў Гомельскай вобласці. Маленькай дзяўчынкай яна чакала таго дня, калі пойдзе ў першы клас. Ёй было толькі сем гадоў, як пачалася вайна. Старэйшаму брату Івану было 18 гадоў, калі пайшоў на фронт. Ён быў малады, высокі і вельмі прыгожы, але ў 1941 годзе немцы забілі яго. І засталася Надзея Фядотаўна адна ў бацькоў.

Зімой 1942 года фашысты ўварваліся ў вёску. Яны вельмі баяліся падхапіць тыф. Усе дзеці, калі ўбачылі немцаў, спалохаліся і схаваліся пад коўдру, а тыя падумалі, што ў доме хварэюць на тыф, і сышлі. Потым немцы выгналі ўсіх з хаты, таму давялося хавацца ў лесе ў зямлянках. Хацелася есці, але нічога не было. Калі атрымлівалася, маці прыносіла маленькі — з палец — кавалачак хлеба, і ўсе былі вельмі рады гэтаму. Так і жылі яны да 1944 года, пакуль немцы не зрабілі на іх аблаву.

Тыя падзеі засталіся ў памяці Надзеі на доўгія гады. Немцы забралі ўсю сям'ю ў канцлагер. Дабіраліся доўга. Спачатку вялі пешшу, потым везлі на цягніку да Берліна. Так даехалі да Нойштата, дзе прабылі два тыдні. Затым павезлі іх у вёску, дзе і знаходзіўся працоўны канцлагер Флосенбюрг.

Калі Чырвоная Армія бамбіла Берлін, немцы заганялі ўсіх у бункеры. Кармілі ў сталовай, дзе працавалі рускія салдаты. Потым іх усіх расстралялі як здраднікаў Радзімы. У канцлагеры трымалі за калючым дротам. Паўсюль былі сабакі і немцы з аўтаматамі. Калі выводзілі з бункера, некаторыя дзеці, старыя і жанчыны падалі ў знямозе ад голаду і холаду. Хлопчыкі грызлі і ламалі дрот, некаторыя з іх змаглі збегчы. Побач быў яшчэ адзін канцлагер. Як казала Надзея Фядотаўна, там бралі дзіцячую кроў для хворых і параненых немцаў. Таксама ў тым лагеры стаялі крэматорыі, дзе потым гэтых дзяцей спальвалі.

Быў ужо 1945 год. Надзея і яе сям'я засталіся жывыя таму, што прыйшлі салдаты Чырвонай Арміі і вызвалілі іх. Потым здолелі дабрацца на цягніку да цяперашняга Светлагорска, пешшу — да сваёй вёскі. Па дарозе дадому Надзея даведалася, што вайна закончылася. Калі дабраліся дахаты, то ўбачылі, што ўсё было спалена. Прыйшлося жыць у суседняй вёсцы Слабодка, дзе потым і засталася ўся сям'я.

Пад канец вайны ёй было адзінаццаць гадоў, і яна пайшла ў школу. Але правучылася толькі чатыры гады, бо дзеці смяяліся з яе, ды і самой сорамна было, што такая дарослая дзяўчына вучыцца з малымі. Пайшла працаваць з маці ў калгас «Малады Ленінец». У 17 гадоў Надзея выйшла замуж. Мужа звалі Пятро. Ён таксама ў дзяцінстве знаходзіўся ў канцлагеры Азарычы.

Цяпер у яе тры сыны і дачка. Ужо зусім дарослыя, але яе не забываюць. Дачка Тоня забрала Надзею Фядотаўну з вёскі ў Бабруйск, дзе жыве ўжо дзесяць гадоў.

З ранняга дзяцінства Надзея Фядотаўна хацела стаць швачкай, але яе мара не спраўдзілася. Таму яна вельмі любіць вышываць і рабіць розныя накідкі для падушак.

Сёння яна ходзіць у царкву, і ёй гэта вельмі падабаецца. Яна па сакрэце расказала мне, што тым, хто ходзіць у храм, Бог заўсёды дапамагае, асабліва тады, калі адбываецца нешта важнае ў жыцці і патрэбна дапамога.



Надзея Фядотаўна жадае, каб не было больш вайны, бо гэта вельмі страшна. Яна так і не забыла усё тое, што было шмат гадоў таму. «Хай на зямлі будзе мір і спакой!» — пажадала ўсім нам Надзея Фядотаўна.

**Маргарыта НАВУМЕНКА,**
**вучаніца 10 класа гімназіі № 2 г. Бабруйска.**

# ДЗЕ СХАВАНА НІТКА-НЕВІДЗІМКА?

**Бабулін куфар... Здаецца, што ў ім такога незвычайнага? Старадаўняя драўляная скрыня, змайстраваная вясковым умельцам. Да пэўнага часу я так і лічыла. Але аднойчы выпадкова адкрыла для сябе такое...**

**Традыцыйна кожнае лета я праводжу ў вёсцы ў маёй любай бабулі Веры Пятроўны Рэўзінай. Было мне тады гадоў шэсць, не больш. У той памятны дзень у нашым двары я з суседскімі дзецьмі гуляла ў хованкі, або, як кажуць у нашай вёсцы, у жмуркі. Мне чамусьці не шанцавала больш за ўсіх: куды ні схаваюся, мяне першую знойдуць. І так крыўдна зрабілася мне, што хоць плач. І тут я ўспомніла пра вялікую драўляную скрыню, што стаяла на верандзе і на якую я звычайна кідаю вопратку, калі прыходжу з вуліцы. Я, доўга не думаючы, ускочыла ў гэтую скрыню, зачыніла за сабою вечка, папярэдне падклаўшы нейкую круглую палачку (пазней ад бабулі даведалася, што гэта было верацяно), каб была магчымасцьназіраць, як мяне шукаюць. Задаволеная сваёй знаходлівасцю (няхай цяпер паспрабуюць знайсці!), я сцішылася, услухоўваючыся ў галасы сяброў. У скрыні было цёмна, але мякка і цёпла. І неўпрыкмет для сябе я... заснула.**

Як сёння помню: сніцца мне дзіўны сон. Мая бабуля ў белай вышыванай кашулі сядзіць за нейкім вялізным прыстасаваннем і вельмі спрытна запускае паміж нацягнутымі ніткамі драўляны насаты прадмет. Пры гэтым цягне да сябе вялізную драўляную расчоску, адначасова націскае, як кіроўца машыны, на педалі. За кожным разам чуецца «стук-стук», і на маіх вачах ніткі ператвараюцца ў рознакаляровае палатно, якое, нібыта канвеер (якраз такі, як у школьнай сталовай), рухаецца ў мой бок. «Стук-стук» — нібы калыханку, спявае станок, і я кудысьці правальваюся.

І зноў аднекуль выплывае родны бабулін твар. Яна схілілася над пяльцамі. З-пад яе рукі выглядваюць маленькія пеўнікі з чырвонымі грабянямі, неяк смешна міргаюць і чамусьці бабуліным голасам спяваюць яе любімую песню «Шумяць вербы»...

Што за дзіва? Дзе я? О, божухна, ды я ж у скрыні! Хачу падняцца, моцна стукаюся галавой аб вечка, якое з грукатам адчыняецца, і на падлогу нешта падае. Збянтэжана гляджу і не магу даць веры сваім вачам! Ды гэта ж даўганосы, вельмі рухавы прадмет, што я бачыла ў сне. Хачу перакапацца, што ўсё гэта наяве, цягнуся да насатага прадмета, але ногі мае заблыталіся ў нечым. Пакуль я спрабавала выбрацца са скрыні, на парозе веранды ўзнікла постаць бабулі. Убачыўшы мяне, яна на некалькі хвілін замірае, а пасля пагрозліва гаворыць:

— Вось ты дзе! Я ўжо з ног збілася, шукаючы вашу міласць (бабуля заўсёды так называе мяне, калі злуецца), думала, не дай Бог, у калодзеж звалілася. Сяброўкі вунь румзаюць, вашу ягамосць шукаючы. А яна сабе палежвае ў куфры, бруднымі нагамі топча святое. І якая трасца цябе сюды занесла?

**«...Хто тую нітачку знойдзе і перадасць сваім дзецям, той будзе самым шчаслівым чалавекам у свеце. Шмат чаго было на маім вяку: і салодкага паспытала, і горкага. А ўсё ж шчасце спазнала. Запомні, унучачка: не дай Бог, каб тая нітачка згубілася або парвалася. Бо нездарма разумныя людзі кажуць: «Не хлебам адзіным...»**

Я маўчу. А бабуліны вочы паступова становяцца такімі, якія я вельмі люблю: цёплымі, лагоднымі, яснымі, як сонейка. Бабуля падымае з падлогі ўжо добра знаёмы мне прадмет, пяшчотна прыціскае яго да грудзей і, уздыхнуўшы, працягвае:

— У гэтым куфры, унучачка, уся мая маладосць схавана, ды і не толькі мая. Куфар гэты змайстраваў яшчэ мой дзядуля. А чаўночак, што ты скінула, — памяць пра кросны, за якімі калісьці сядзела мая бабуля, затым — маці, а пасля і я. Няма даўно кроснаў, а вось палатно, вытканае на іх, захоўваю і сёння. А дыванкі, па якіх ты ходзіш, гэта таксама плён маіх рук. Шмат чаго ўмелі рабіць рукі тваёй бабулі. Кожная рэч мае сваю гісторыю. У гэтай сукенцы я выходзіла замуж за твайго дзядулю. Вось у тым маленькім вузельчыку я захоўваю рэшткі зерня, якім пасыпалі нас у дзень вяселля, каб наша сям'я жыла багата і шчасліва. Глядзі, унучачка, колькі ручнікоў вышыла твая бабуля! Асабліва люблю гэты, з пеўнямі.

Бабуля, захопленая ўспамінамі, расказала, як доўгімі зімовымі вечарамі збіраліся па хатах. Жанчыны пралі кужаль, вышывалі, спявалі. Мужчыны майстравалі дзежкі, ночвы, выразалі лыжкі, сальніцы, плялі кошыкі і вялізныя кашы. Яна дастала нешта з прыскрынка.

— Шпулькі для нітак, як лялькі. Нябожчык сусед (няхай будзе пухам яму зямля) адзіны на ўсю вёску мог такія спраўныя рабіць.

— Бабулька, а што там на дне куфра ў клуначку?

— Гэта, даражэнькая, я падрыхтавала сабе ў апошнюю дарогу. Мяккія тапачкі бо ў чаравіках мне будзе ўжо цяжка хадзіць. Вышываная кашуля і фартух. Спадніцу твая маці сшыла. Цёплая мяккая кофта: нешта пачала я мерзнуць. І хустка вельмі прыгожая. Сынок на свята падарыў.

Бабуля акуратна складвае ўсё, звязвае зноў у клунак, уладкоўвае на былое месца, дастае нешта, загорнутае ў паперу, змахвае фартухом пыл, сумна ўздыхае:

— А тут фотаздымкі... Іх няшмат... парыжэлі ад даўніны, выцвілі... На іх гісторыя нашага роду... Гэта твой прадзед, загінуў у вайну. Добрай душы быў чалавек.

Перабіраю фота і толькі дзіву даюся: маленькая бабуля як дзве кроплі вады падобна да мяне. Вось яна побач з дзядулем. Па ўсім відаць, што шчаслівая.

Выцягваем з бабуляй усё, што ёсць у куфры. Я рассцілаю рознакаляровыя дыванкі, ступаю па іх босымі нагамі і адчуваю незвычайную мяккасць і, мусіць, цеплыню бабуліных рук.

Саматканыя посцілкі казычуць твар, здзіўляюць незвычайнасцю свайго арнаменту. А на абрусах раскінуліся вялізныя букеты чырвоных руж і пунсовых макаў. А колькі тут ручнікоў! Набожнікі, расшытыя валошкамі, пеўнямі, рамонкамі, вясельныя ручнікі з галубамі. Вышываныя кашулі, спадніцы, квяцістыя хусткі. У прыскрынку нейкія шпулькі, старамодныя завушніцы, пярсцёнкі, каралі.

— Бабулька, — шапчу я ў захапленні, — якія ў цябе залатыя рукі! Я цябе люблю моцна-моцна, мацней за ўсіх на свеце. Я думала, што ты звычайная, як усе бабулі, а ты чараўніца.

— Не, унучачка, рукі мае не залатыя, а проста працавітыя, як ва ўсіх вясковых жанчын, — гаворыць бабуля, хаваючы рукі пад фартух, нібы саромеючыся іх, і неяк загадкава ўсміхнуўшыся, дадае: — І не я чараўніца, а вось гэты куфар, бо ў ім схавана нітка-невідзімка. І хто тую нітачку знойдзе і перадасць сваім дзецям, той будзе самым шчаслівым чалавекам у свеце. Шмат чаго было на маім вяку: і салодкага паспытала, і горкага. А ўсё ж шчасце спазнала. Запомні, унучачка: не дай Бог, каб тая нітачка згубілася або парвалася. Бо нездарма разумныя людзі кажуць: «Не хлебам адзіным...»

І тут бабуля, быццам успомніўшы нешта вельмі важнае, падскочыла з табурэта:

— Ат, толькі душу развярэдзіла. Кладзі ўсё ў куфар. Зараз будзем вячэраць.

Я заўважыла, як яна на хаду выцерла слязу, але нічога не сказала. Я думала пра апошнія бабуліны словы. У той дзень я абмацала кожны куточак куфра, шукаючы нітку-невідзімку. Не знайшоўшы, вырашыла, што бабуля, як заўсёды, пажартавала.

Сёння я ўжо добра ведаю, што мела на ўвазе мая бабуля-жартаўніца, мая нястомная працаўніца і сапраўдная чараўніца. І некалі я абавязкова раскажу пра чароўны бабулін куфар сваім унукам, каб не парвалі яны тую тоненькую, але даволі трывалую нітку-невідзімку, што навекі звязвае пакаленні людзей.

**Аліна АНДРЭЕНКА,**
**вучаніца 9 класа гімназіі № 58 г. Гомеля імя Ф.П. Гааза.**



### ПРА АЎТАРА

Раней Аліна займалася... скалалазаннем. А цяпер вельмі любіць вандраваць, слухаць музыку, маляваць. Чытае пераважна сусветную класіку. А яшчэ, па яе ўласным прызнанні, любіць пасядзець разам са сваімі роднымі і пагутарыць пра жыццё ці паспяваць душэўныя песні пад гітару. Дарэчы, на ёй дзяўчына вучыцца іграць.

— Менавіта добрая музыка і кнігі, прыгожыя карціны натхняюць мяне на творчасць, — гаворыць 15-гадовы аўтар. У людзях Аліна больш за усё цэніць дабрыню і шчырасць.

Кім хоча стаць у будучым, пакуль яшчэ не вызначылася. Што датычыцца дасланай у рэдакцыю «пробы пяра», дык на «такім узроўні», як заўважыла сама Аліна, гэта яе першы досвед.

# З ПЕСНЯЙ, ШТО ІДЗЕ АД ДУШЫ!

***«...Калі пяюць песні ў вас? ...Пяюць на Каляды, на запускі, на Вялікдзень, на Тройцу, на Яна Купалу, у Пятроўку, на зажынках і дажынках. Пяюць на радзінах і хрэсьбінах, пяюць дзіцё калыхаючы, і самі дзеці пяюць гуляючы; пяюць на ігрышчах і веселлі, і на хаўтурах, і ў бяседзе, і пры працы, і на вайну ідучы, і ўва ўсякай іншай прыгодзе. Увесь круглы год пяюць».***

**М. Багдановіч «Апокрыф»**

Мова нашага народа — адна з самых мілагучных і меладычных у свеце. І не дзіва, што беларусы любяць спяваць. Класік беларускай літаратуры Максім Багдановіч вельмі трапна заўважыў, што ў Беларусі спяваюць круглы год. І з гэтым цяжка не пагадзіцца.

Колькі сябе памятаю, я заўсёды чула спевы: матуля спявала калыханкі — спачатку мне, а потым маім малодшым братам. Бабуля ў вёсцы спявала, калі палола градкі і расчэсвала валасы, жала жыта і вязала снапы, мыла бялізну і гатавала ежу. Спяваюць у маёй сям'і не толькі жанчыны. Бацька — удзельнік народнага вакальнага калектыву. Песні ў яго выкананні можна пачуць не толькі ў нашай кватэры, але і ў канцэртных залах.

З дзяцінства я, напэўна, як і большасць дзяцей, любіла спяваць. Гэта заўважыла музычны кіраўнік дзіцячага садка. Два гады запар мне пашчасціла быць удзельніцай творчага конкурсу для дзяцей — выхаванцаў дзіцячых садоў для чыгуначнікаў Магілёва, які называўся «Хрустальны чаравічок».

Потым была музычная школа. Чатыры гады вучобы здаваліся бясконцымі. А сёння, азіраючыся на мінулае, я шкадую, што не хапіла цярпення скончыць поўны курс музычнай школы, што атрымала толькі пачатковую музычную адукацыю. Бо нішто не параўнаецца з магчымасцю несці музыку і свой настрой у залу, да слухача.

Любоў да музыкі і спеваў прывяла мяне ў гурток мастацкай самадзейнасці Дома культуры чыгуначнікаў. Сёння я з'яўляюся актыўнай удзельніцай розных канцэртаў і музычных конкурсаў. Мне вельмі падабаецца стаяць на сцэне і спяваць.

Дарэчы, спяваю я не толькі на сцэне. Без спеваў я ўжо не ўяўляю свайго жыцця. Я спяваю, калі мне сумна і весела, калі хвалююся і радуюся. Спяваю для маці і таты, для бабулі і малодшых братоў. А па святах, калі наша сям'я збіраецца разам, мы з татам спяваем дуэтам. Праз песню можна перадаць і любоў да родных і блізкіх, і пачуццё павагі да дарослых, і пачуццё гонару за сваю сям'ю і сваю зямлю.

Таму сто разоў меў рацыю Максім Багдановіч, калі пісаў у «Апокрыфе», што спяваюць на нашай зямлі ўсе: і дзеці, і дарослыя, і жанчыны, і мужчыны. І нам не трэба нейкай асаблівай нагоды для таго, каб спяваць. Бо, калі спявае душа, хочацца спяваць так, каб песню, якая ідзе ад яе, ад сэрца, чула як мага больш людзей.

**Вольга БЯЛЯСАВА, вучаніца 9 класа гімназіі № 3 г. Магілёва.**

**ПРА АЎТАРА**

*Вользе 15 гадоў. Пасля заканчэння базавай школы дзяўчына плануе працягнуць навучанне — пайсці ў 10 клас.*

*— На працягу васьмі гадоў я з'яўляюся ўдзельніцай дзіцячага вакальнага ансамбля «Паляўнічыя за ўдачай». Вельмі люблю спяваць, таму маё жыццё багата на разнастайныя канцэрты і конкурсныя праграмы (пацвярджаем: з Вольгай доўгі час не атрымлівалася пагутарыць, бо яна пастаянна некуды бегла па справах. — **Рэд.**), — кажа пра сябе аўтар. — Так, сёлета наша сям'я прымала ўдзел у гарадскім конкурсе «Сям'я года — 2014», а зусім нядаўна я стала пераможцай гарадскога конкурсу «Звонкі капеж». Акрамя спеваў, захапляюся вышыўкай, люблю чытаць фантастыку. Мару паступіць ва Універсітэт культуры на факультэт культуралогіі.*

# ЗЗЯЮЦЬ ТАЛЕНТЫ Ў ЯЕ «ВЯСЁЛЦЫ»

**У цэнтры творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік» шмат цікавых гурткоў, у якіх дзеці вучацца рабіць нешта новае, развіваюць свае здольнасці. Неяк я зазірнула ў студыю «Вясёлка». Сцены кабінета ўпрыгожваюць шматлікія дзіцячыя малюнкі і вырабы. Дзяўчынкі старанна скручваюць трубачкі з газеты.**

**— Для чаго вы гэта робіце? — пацікавілася я.**

**— З гэткіх трубачак мы будзем плесці кошыкі, — патлумачылі рукадзельніцы.**

**Разглядваючы працы, з цяжкасцю верылася, што такая прыгажосць робіцца са звычайнай газеты. Гэтай тэхніцы і не толькі ёй навучыла дзяцей выдатны педагог, кіраўнік студыі Наталля Барысаўна Утулкіна.**

Яна з самага дзяцінства была схільная да творчасці. Скончыла дзіцячую мастацкую школу. Любіла маляваць з натуры, асабліва краявіды. І не дзіўна, бо ў яе родзе быў вядомы майстар Мікалай Кастроў, жывапісец, графік, член Саюза мастакоў РСФСР. Але любімым мастаком Наталля Барысаўна называе Ісака Левітана:

— Ён пісаў пейзажы, якія нагадвалі мае родныя мясціны. Я нарадзілася ў Расіі, у Кіраўскай вобласці, затым пераехала з сям'ёй на Урал. Калі гляджу на яго пейзажы, напоўненыя прасторай, асабліва з выявай Волгі, з настальгіяй успамінаю пра малую радзіму.

Па волі лёсу жанчына разам з мужам апынулася ў Маладзечне, «у гэтым прыгожым і сонечным горадку». Тут яна стала працаваць з дзецьмі спачатку ў абласным цэнтры дзіцячай творчасці , а затым у цэнтры творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік».

Студыю выяўленчага мастацтва «Вясёлка» наведваюць больш за 30 хлопчыкаў і дзяўчынак. Яны з энтузіязмам займаюцца маляваннем, лепкай, пап'е-машэ. Цікавая і незвычайная тэхніка тарцавання: дзеці наразаюць дробныя кавалачкі



паперы розных адценняў і наляпляюць іх на аснову. Так паступова вымалёўваецца пэўная карцінка. Цяпер навучэнцы захапіліся новай тэхнікай — дэкупаж (афармленне прадметаў пры дапамозе сурвэтак).

Старанні хлопчыкаў і дзяўчынак не засталіся па-за ўвагай. Напрыклад, Аляксандра Мельнікава з'яўляецца пераможцай абласнога конкурсу «Мой край — Белая Русь» у намінацыі «Беларускія нацыянальныя традыцыі і абрады». У абласным этапе рэспубліканскага конкурсу «Прывітанне, сусвет!» адзначаны Аліна Шастоўская, Дзмітрый Тамашэвіч, Надзея Сівец і Анастасія Грышчанкова. А праца з цеста Ксеніі Рагель стала прызёрам рэспубліканскага конкурсу «Калядная зорка». Таксама студыя «Вясёлка» ўзнагароджана за актыўны ўдзел у міжнародным конкурсе «Калядная паштоўка».

Заняткі ў гуртку паўплывалі на далейшы выбар прафесіі некаторых падлеткаў. Напрыклад, летась Паліна Амангельдзіева паступіла ў гімназію-каледж мастацтваў у Маладзечне на спецыяльнасць «Выяўленчае мастацтва», паспяхова займаецца на першым курсе. Ёй вельмі падабаецца там вучыцца.

На думку Наталлі Барысаўны, настаўнік — шырока адукаваная асоба, прычым не толькі ў тым кірунку, у якім вядзецца выкладанне. Ён павінен разбірацца ў дзіцячай псіхалогіі, быць для навучэнцаў сябрам, каб нешта параіць, падказаць, а часам — і... мамай. Асабліва гэта важна для педагога дадатковай адукацыі.

— Галоўныя каштоўнасці ў жыцці для мяне — гэта сям'я, а таксама шчырыя адносіны паміж людзьмі, — сцвярджае яна.

У вольны час Наталля Барысаўна чытае. А цяпер стала патроху асвойваць камп'ютар, каб не адстаць ад моладзі, быць у курсе падзей у свеце і ў краіне.

Напрыканцы нашай гутаркі педагог пажадала дзецям выбраць шлях па душы, бо калі займаешся любімай справай, то ў жыцці ўсё атрымліваецца. А калегам — таленавітых вучняў і радасці ад творчага працэсу!

**Дар'я ЦАУНЯ, вучаніца 11 класа СШ № 8 г. Маладзечна.**

**ПРА АЎТАРА**

*Дар'я ўжо трэці год займаецца ў школе журналістыкі «Маладзік» пры цэнтры творчасці дзяцей і моладзі. Запісалася ў гурток яшчэ ў 9 класе, бо добра піша сачыненні, да таго ж дзяўчыне падабаюцца зносіны з новымі людзьмі. Таму чаго здзіўляцца, што сваё жыццё Дар'я плануе звязаць з прафесіяй журналіста? На сёння дзяўчына мае ўжо даволі сур'ёзны архіў уласных публікацый: друкавалася ў выданні для падлеткаў, у мясцовых газетах. Ды і ў творчых конкурсах ёй даводзілася браць удзел. Апошнім часам 17-гадовы аўтар старанна рыхтавалася да паступлення: вучыла гісторыю, запісалася на курсы.*

*Калі выпадае вольны час, Дар'я любіць чытаць кнігі. Самыя любімыя аўтары — Стывен Кінг і Паўла Каэлья. Летам падабаецца хадзіць у лес. Дзяўчына лічыць, што сапраўдных сяброў шмат не бывае.*

# СУМ БЛАКІТНЫХ ВАЧЭЙ

**ПРА АЎТАРА**

*14-гадовай Марыі вельмі падабаецца беларуская мова і літаратура. Сёлета яна стала пераможцам III этапу рэспубліканскай алімпіяды па гэтым прадмеце. У чытанні таксама аддае перавагу беларускай літаратуры. Любіць пісаць вершы і апавяданні, друкавалася ў раённай газеце. Менавіта гэта ўсё натхніла яе прыняць удзел у конкурсе «Мы — такія!..»*

*А яшчэ Марыя займаецца навуковай дзейнасцю: даследуе разам з настаўніцай тапонімы Дабравольскага сельсавета, кажа, што зацікавілі многія назвы. Прымае ўдзел у раённых навукова-практычных канферэнцыях. З'яўляецца членам «Аховы птушак Бацькаўшчыны».*

*— У вольны час мне падабаецца фатаграфаваць прыроду і маляваць партрэты, — распавяла наш аўтар у тэлефоннай размове. — У далейшым хачу паступіць у медыцынскі ўніверсітэт.*

**Я люблю ўспамінаць прыемныя моманты з дзяцінства, якія, нібы сонечны праменьчык, саграваюць сэрца. І колькі прыгадваю сябе ў дашкольным узросце, заўсёды бачу дзядулю Паўла. Ён жыў недалёка, сябраваў з маім дзедам і часта прыходзіў да нас. Памятаю, як мы з сястрой чакалі яго прыходу. І гэта нездарма. Ён заўсёды прыносіў цукеркі, іншы раз гуляў з намі. Але больш за ўсё нам падабалася тое, што ён размаўляў з намі, як з дарослымі.**

Гуляючы з гэтым дзядулем, я неаднойчы звяртала ўвагу на яго вочы. Яны былі блакітнага колеру. Аднак я заўважыла, што, нават калі дзядуля быў вясёлы, у яго вачах заўсёды быў сум. Гэта мяне вельмі здзіўляла. Але што я магла разумець тады?

...Як сёння памятаю той майскі дзень... Раніцай дзед Павел завітаў да нас. Але апрануты ён быў незвычайна: прыгожы цёмна-сіні касцюм, на пінжаку якога зіхацелі медалі. Дзядуля павітаўся з намі, усе яго віншавалі. І толькі мне адной было незразумела, што за свята ў дзеда Паўла. Выбраўшы зручны момант, я спытала:

— У вас сёння дзень нараджэння?

Дзядуля ўсміхнуўся і пакачаў галавой. Потым сур'ёзна запытаўся ў мяне:

— Ведаеш, што такое вайна?

— Ведаю. Наша краіна ваявала з фашыстамі. Гэта вялікая бяда. Так казала мая бабуля.

Дзядуля ўсміхнуўся і пагладзіў мяне па галаве:

— Так, ты разумееш. Але не так, як ведаюць некаторыя. І дай Бог, усім ніколі не бачыць вайны...

Сказаўшы гэта, дзядуля пайшоў. А я яшчэ нейкі час стаяла, здзіўленая і пакрыўджаная адначасова. Чаму гэта я не ведаю? Хіба не так тлумачыла мне мая бабуля?

...Восенню я пайшла ў першы клас, аднак маё сяброўства з дзядулем не абарвалася. Толькі цяпер ужо я расказвала яму пра вучобу, хвалілася сваімі першымі поспехамі. І ён радаваўся за мяне, даваў парады, падбадзёрваў.

У чацвёртым класе мяне чакаў яшчэ адзін важны крок у школьным жыцці. Я стала піянеркай. Прыйшоўшы са школы, вядома, расказала пра гэта дзеду Паўлу. Паказала яму піянерскі гальштук. Ён радаваўся разам са мною. Але мне ў памяць урэзаліся яго словы:

— Ну вось, цяпер ты ўжо піянерка. Яны заўсёды робяць людзям добрае. Таму дары ўсім дабрыню калі не справамі, дык усмешкай...

Набліжаўся Дзень Перамогі. Кожны піянер ведаў, чаму і ў гонар каго адзначаецца гэтае свята. Наша піянерская арганізацыя рыхтавала віншавальныя паштоўкі для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Кожны атрымаў даручэнне: павіншаваць ветэрана са святам.

І вось наступіла святочная майская раніца. Я прыгожа апранулася, завязала гальштук, узяла падарунак і кветкі і пайшла да дзеда Паўла. Нясмела пастукала ў дзверы. Дзядуля адчыніў, і я звярнулася да яго:

— Паважаны Павел Сцяпанавіч! Я і ўсе піянеры нашай школы віншуем вас з Днём Перамогі! Дзякуй вам за мірнае неба, за наша шчаслівае дзяцінства!..

І тут першы раз за ўсё наша сяброўства дзядуля заплакаў...

— Дзякуй табе, дзякуй усім вам за тое, што не забываеце...

Пасля хвіліны маўчання я ўпэўнена сказала яму:

— Цяпер я ведаю, што ў вас было за свята!

Ён усміхнуўся...

Пасля гэтага я стала ганарыцца тым, што сябрую з ветэранам. Нам на ўроках расказвалі пра жорсткасць вайны, мы чыталі ўспаміны беларускіх дзяцей з кнігі «Ніколі не забудзем». Я кожны раз пытала ў дзядулі Паўла, ці сапраўды так было. На што ён часцей за ўсё адказваў:

— Так, усякае было. Іншы раз сэрца сціскалася ад болю, калі глядзеў на забітых немаўлят, на спаленыя хаты, калі чуў плач жанчын і спалоханых дзяцей...

...Мы працягвалі сябраваць. Дзед Павел па-ранейшаму прыходзіў да нас у госці. Канешне, мы не гулялі з ім, аднак нашы размовы станавіліся сур'ёзнымі. Цяпер Павел Сцяпанавіч распавядаў пра свае ваенныя будні. Расказваў пра тое, як быў у Берліне, успамінаў сваіх сяброў, якія загінулі ў баі. Я слухала яго аповеды, і маё сэрца поўнілася гонарам за дзядулю, за сваю вёску, за Беларусь... Нават не верылася, што гэты добры і шчыры чалавек, які сядзеў каля мяне, бачыў жахі вайны, адчуваў боль страт...

Цяпер для мяне стала традыцыяй віншаваць Паўла Сцяпанавіча з Днём Перамогі. І кожны раз, калі я яму ўручала падарунак, дзядуля плакаў. Ведаю, яму было балюча ад успамінаў...

Сёлета я вырашыла зрабіць Паўлу Сцяпанавічу сюрпрыз — павіншаваць яго разам са сваімі аднакласнікамі з Днём абаронцаў Айчыны. І вось сонечным зімовым днём мы ўсе разам завіталі да дзядулі. Мяне ўзрушыла тое, што Павел Сцяпанавіч сябе вельмі дрэнна адчуваў: з цяжкасцю падняўся з ложка. У блакітных вачах заблішчалі слёзы... Ён шчыра дзякаваў нам, а калі мы ўжо накіраваліся да дзвярэй, ціхенька мне сказаў:

— Я ведаю, што гэта твая задума. Дзякуй, мне вельмі прыемна...

І ўсміхнуўся...

На наступны дзень я даведалася ад бацькоў, што Павел Сцяпанавіч памёр...

Стала неяк пуста на душы. Я страціла старэйшага сябра, мудрага дарадчыка, цудоўнага чалавека... Здаецца, учора мы яго віншавалі, учора ён мне так шчыра ўсміхнуўся... І мне горка ад таго, што цяпер я не падару кветкі Паўлу Сцяпанавічу, а пакладу іх яму на магілу.

Я памятаю ўсё: ад тых вясёлых гульняў у мячык з дзядулем да апошняй яго ўсмешкі. Бачу блакітныя вочы Паўла Сцяпанавіча, напоўненыя сумам, і сэрца сціскаецца ад таго, што з кожным годам становіцца ўсё менш і менш ветэранаў — людзей, якія неаднойчы глядзелі ў твар смерці, якія не шкадавалі сябе дзеля нашага шчаслівага жыцця, якія падарылі нам мірнае неба над галавой... Светлая памяць вам, нашы героі!

**Марыя ІВАНЮК, вучаніца 9 класа Дабравольскага дзіцячага сада — сярэдняй школы Свіслацкага раёна.**

# УВАГА! ПАДАЁМ ДАКУМЕНТЫ Ў АСПІРАНТУРУ

Научно-методическое учреждение
## «Национальный институт образования»
Министерства образования Республики Беларусь
## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ за счет средств республиканского бюджета НА 2014 ГОД

### СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В АСПИРАНТУРЕ:

**09.00.11 «Социальная философия»** (1 место на обучение в дневной форме, 1 место на обучение в форме соискательства);

**13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования»** (1 место на обучение в заочной форме);

**13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)»** (9 мест: 1 место на обучение в дневной форме, 1 место – на обучение в заочной форме, 7 мест на обучение в форме соискательства);

**13.00.03 «Коррекционная педагогика»** (2 места на обучение в заочной форме).

Срок обучения в аспирантуре: **в дневной форме** – до 3-х лет, **в заочной форме** – до 4-х лет, в форме соискательства – до 5-ти лет.

Поступающие в аспирантуру для получения научной квалификации «Исследователь» в дневной или заочной форме получения образования должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления в аспирантуру.

Поступающие в аспирантуру должны иметь опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования, либо рекомендацию ученого совета (совета) учреждения высшего образования или факультета учреждения высшего образования (для поступающих в год окончания обучения в данном учреждении).

Для поступающих на обучение в заочной форме и в форме соискательства опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования, является обязательным.

Поступающие в аспирантуру для обучения в дневной или заочной форме получения образования сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине в объеме учебной программы I ступени высшего образования. Для получения послевузовского образования в аспирантуре в форме соискательства сдача вступительного экзамена не требуется.

### СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В ДОКТОРАНТУРЕ:

**13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)»** (1 место на обучение в дневной форме, 1 место на обучение в форме соискательства).

В докторантуру принимаются лица, имеющие ученую степень кандидата наук и являющиеся авторами научных исследований, которые составят основу докторской диссертации с возможностью ее завершения в течение трех лет.

**ОСУЩЕСТВЛЯЕТСЯ ТАКЖЕ ПОДГОТОВКА ДОКТОРОВ И КАНДИДАТОВ НАУК НА ПЛАТНОЙ ОСНОВЕ.**

**Прием документов – с 1 августа по 30 сентября.**

Вступительные испытания будут проходить с 1 по 20 октября.

**Начало занятий – 1 ноября.**

С условиями приема можно ознакомиться на сайте института
**http://www.adu.by.**

Обращаться по адресу:
**220004, г. Минск, ул. Короля, 16, каб. 110.**

**Телефоны для справок: 8 (017) 200 53 38, 8 (017) 229 19 59.**

УНП 190374888 Дирекция института

## Полесский государственный университет ПРОВОДИТ ПРИЕМ

УНП 290473286

### В очную аспирантуру по специальностям:

08.00.05 — экономика и управление народным хозяйством — 1 человек;
08.00.10 — финансы, денежное обращение и кредит — 1 человек;
13.00.04 — теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры — 1 человек;
03.01.06 — биотехнология — 4 человека.

### В заочную аспирантуру по специальностям:

13.00.04 — теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры — 1 человек;
03.01.06 — биотехнология — 1 человек.

**Прием документов с 1 августа по 30 сентября 2014 года по адресу: ул. Пушкина, 4, 225710, г. Пинск, тел. (0165) 31-08-56.**

Подробная информация на сайте университета: **http:\\www.psunbrb.by.**

УО «Белорусский государственный университет транспорта»
## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ НА ПЕРВУЮ СТУПЕНЬ ПОСЛЕВУЗОВСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ (АСПИРАНТУРУ) НА 2014 ГОД

**На дневную форму послевузовского образования по специальностям:**

| Шифр | Специальность | План приема |
|---|---|---|
| 01.02.06 | Динамика, прочность машин, приборов и аппаратуры | 1 |
| 05.16.09 | Материаловедение (машиностроение) | 1 |
| 05.22.08 | Управление процессами перевозок | 1 |
| 08.00.05 | Экономика и управление народным хозяйством | 1 |

**На заочную форму послевузовского образования по специальности:**

| Шифр | Специальность | План приема |
|---|---|---|
| 01.02.04 | Механика деформируемого твердого тела | 1 |

**По форме соискательства по специальности:**

| Шифр | Специальность | План приема |
|---|---|---|
| 05.22.07 | Подвижной состав железных дорог, тяга поездов и электрификация | 1 |

**Подготовка ведется не только за счет бюджетных средств, но и на условиях оплаты за обучение.**

**Прием документов с 28 августа по 30 сентября 2014 г. по адресу: 246022 г. Гомель, ул. Кирова, 34, каб. 272.**

**Справки по телефону: (8 0232) 95 34 95.** УНН 400057727

## В 2014 ГОДУ В АСПИРАНТУРУ учреждения образования «Мозырский государственный педагогический университет имени И.П. Шамякина» ОБЪЯВЛЕН НАБОР ЛИЦ ДЛЯ ОБУЧЕНИЯ ЗА СЧЕТ СРЕДСТВ РЕСПУБЛИКАНСКОГО БЮДЖЕТА по следующим специальностям:

**• на дневную форму получения послевузовского образования**

| Шифр | Специальность | Срок обучения | План приема |
|---|---|---|---|
| 10.02.01 | Белорусский язык | 3 года | 1 |
| 10.02.02 | Русский язык | 3 года | 1 |
| 13.00.01 | Общая педагогика, история педагогики и образования | 3 года | 4 |

**• на заочную форму получения послевузовского образования**

| Шифр | Специальность | Срок обучения | План приема |
|---|---|---|---|
| 13.00.01 | Общая педагогика, история педагогики и образования | 4 года | 1 |

**Прием документов осуществляется с 1 августа по 30 сентября 2014 года по адресу: г. Мозырь, ул. Студенческая, 28, ауд. 220.**

**Справки по телефону: 8-0236-32-43-79.** УНП 400083888

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукционных торгов по продаже имущества, обращенного в доход государства

| № лота | | 1 |
|---|---|---|
| Наименование объекта | | Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-69179 площадью 1043,6 кв.м (торговое помещение на 4-м этаже капитального строения с инвентарным номером 100/С-2354 на земельном участке с кадастровым номером 140100000001008926 площадью 0,2998 га). *Характеристика: материал кирпич, ж/б панели, 1975 год постройки, стены кирпичные, перегородки гипсокартон, перекртия ж/б, полы плиточные, окна и двери ПВХ стеклопакеты, филенчатые, отопление центральное, электроснабжение – скрытая электропроводка, водопровод и канализация есть, износ 12%.* |
| Местонахождение объекта | | г. Брест, ул. Московская, 202 |
| Начальная цена продажи с НДС, руб. | | 11 501 204 600 |
| Сумма задатка, руб. | | 1 150 120 000 |

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Указом Президента РБ от 04.09.2006 №559.

Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью».

**При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, предоставляет:**
• копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;
• документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица и его паспорт;
• паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенная доверенность для представителя физического лица;
• заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающие внесение задатка в размере 10% от начальной цены объекта;
• организациями нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе);
• организациями и физическим лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на бел. (рус.) язык;
• представителями организаций и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924.**

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:
• **в течение 3 рабочих дней** с даты проведения торгов оплатить сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.
• в течение 2 месяцев и 25 дней с даты проведения торгов и подписания протокола о результатах аукциона осуществить оплату за предмет аукциона. Право собственности на приобретенный на аукционе объект недвижимости, обращенный в доход государства, регистрируется в соответствии с законодательством.

**Победителю аукциона для обслуживания приобретенного объекта отвод земельного участка будет осуществлен в установленном законодательством порядке**.

**Аукцион состоится 31 июля 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 26.06.2014 г. до 17.30 25.07.2014 г. по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**
**Контактные телефоны: 53-81-92, 53-45-65.**
**Сайт: bgcn.by, city.brest.by**

Утерянный студенческий билет № 321210927 УО «Институт современных знаний» на имя ПАКАЛЮК Дмитрия Ивановича **считать недействительным.**

## ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
## 13 августа 2014 г. проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение – строительство | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ | Срок аренды (лет) | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей | Затраты на подготовку документации, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Войсковая, 14 а | 340100000006004974 | 0,2838 | для строительства и обслуживания здания специализированного по ремонту и техническому обслуживанию автомобилей и (или) автомойки, и (или) шиномонтажа или производственно-складских помещений (земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения) | к землям сельскохозяйственного назначения не относятся | Ограничения в использовании – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения площадью 0,0724 га, охранная зона линий электропередач напряжением свыше 1000 вольт площадью 0,0040 га. Условия: согласование проектно-сметную документации с городским узлом электросвязи, ГФРУПЭ «Белтелеком», с собственниками водопровода | 30 | 250 901 550 | 50 180 000 | 11 110 657 |
| 2 | район индивидуальной жилой застройки Романовичи, участок 929 | 340100000008004483 | 0,0810 | для строительства и обслуживания жилого дома (земельный участок для размещения усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | | Ограничений в использовании нет. | 99 | 12 363 950 | 2 472 750 | 7 557 430 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462, а также в соответствии с Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 607 «О внесении дополнений и изменений в некоторые постановления Совета Министров Республики Беларусь по вопросам проведения аукционов, конкурсов». Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту.

3. **Аукцион состоится 13 августа 2014 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в управление коммунальной собственности в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на р/с 3642402000226 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности горисполкома. Кроме того представляют:

4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

4.6 представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, и его копию.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 7 августа 2014 г.** включительно в управлении коммунальной собственности горисполкома по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а (каб. № 4). Лот № 2 выставляется на аукцион повторно. Извещение было опубликовано в газете «Звязда» 3 апреля 2014 г.

Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.00 до 14.40 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

**Контактные телефоны: 77-69-35; 77-67-27; факс: 77-48-85. Наш сайт – www.gorod.gomel.by.**

*Суладдзе*

# КАЛІ МАМА І ТАТА «ПРАЦУЮЦЬ»... СТУДЭНТАМІ,

## альбо Як сумясціць вучобу, сямейнае жыццё і выхаванне дзіцяці?

**Для большасці людзей вучоба ва ўніверсітэце — гэта час пошуку сябе і своеасаблівы прыпынак перад новым жыццёвым этапам: шлюбам ці пабудовай кар'еры. Мінскія студэнты Дзмітрый і Вераніка Сеген «стандартную схему» парушылі. Абое яшчэ хоць і вучацца, але не сталі адкладваць надоўга стварэнне сям'і, у якой ужо падрастае маленькі сын Глеб. Нашы карэспандэнты сустрэліся з маладой парай і пагутарылі пра тое, як маладыя людзі адчуваюць сябе ў ролі мамы і таты, ці лёгка дзяліць свае сілы паміж дзіцем і парамі ва ўніверсітэце, а таксама чаму вялікая адказнасць — велізарны стымул дабіцца чагосьці ў жыцці...**

...— Хлопец у нас з характарам, увесь у тату. Пакуль не зробіш, што ён хоча, спакою не будзе. Відаць, цудоўна разумее, што ён у нас першы і вельмі чаканы, і ўсе круцяцца вакол яго, — распавядае Дзмітрый пра сына, пакуль Вераніка на кухні заварвае гарбату для гасцей.

Па тэлевізары паказваюць вячэрні выпуск навін, гук крыху прыцішаны. Маленькі Глеб спакойна ляжыць у сваёй люльцы і раз-пораз чамусьці хітра ўсміхаецца. Пакуль што ён не асабліва знаёмы з гэтым светам, нават фатаграфаваць яго бацькі не асмельваюцца: надта ўжо хлопчык адчувальны да чужых вачэй, адразу пачынае капрызіць. Вядома, дзіцяці толькі некалькі месяцаў.

Дзмітрый і Вераніка раслі ў розных кутках Беларусі. Ён родам з Давыд-Гарадка, яна прыехала ў Мінск са Шчучына, а пазнаёміліся па-сучаснаму, праз інтэрнэт.

— Не, гэта быў не сайт знаёмстваў, — смяецца Вераніка. — Калі памятаеце, некалькі гадоў таму ўсе актыўна карысталіся для інтэрнэт-перапіскі «Агентам», які цяпер ужо не асабліва папулярны.

Дзмітрый тады ўжо вучыўся на падрыхтоўчых курсах пры ўніверсітэце, а яго будучая жонка была яшчэ школьніцай (цяпер Веранiцы дваццаць гадоў, а яе муж — на тры гады старэйшы).

— Я проста пабачыў на фота дзяўчыну і вырашыў ёй напісаць. Сам не ведаю чаму. Тым больш, што на той момант яна жыла далёка, — успамінае Дзмітрый.

Як бывае ў падобных рамантычных гісторыях, у Веранікі на той момант ужо быў хлопец. Але шматгадзінныя размовы па тэлефоне і «кіламетры» перапіскі, на дзіва, аказаліся мацнейшымі за рэальныя адносіны. За кароткі час новы знаёмы здолеў пакарыць сэрца дзяўчыны настолькі, што яна дзеля яго вырашыла атрымліваць адукацыю менавіта ў Мінску, каб зносінам не замінала адлегласць.

У выніку знаёмства праз інтэрнэт атрымалася працяг. А мінулым летам Вераніка і Дзмітрый вырашылі ажаніцца.

Цікаўлюся, ці не страшна было так адразу асмеліцца на нараджэнне дзіцяці? Бо трэба здаваць сесіі, жыць на здымнай кватэры. Дзмітрый на момант нашай гутаркі заканчваў навучанне ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце, атрымліваў дыплом настаўніка геаграфіі і біялогіі, а яго жонка зараз вучыцца ў Беларускім інстытуце правазнаўства. Вераніка — будучы юрыст.

> **Самае цікавае, што нават пры такім рэжыме дня Вераніка часам ходзіць на пары. Гледзячы на зусім малое дзіця, уявіць гэта складана.**

— У нашым акружэнні гэта нікога не здзівіла, — распавядае Вераніка. — Напрыклад, адна мая аднакурсніца даўно перавялася на «завочку», на сёння паспела нарадзіць дваіх, і ў Дзімы таксама ёсць некалькі сямейных аднакурснікаў.

Пакуль мы гутарым, Дзмітрый гушкае малога, які ўжо нацешыўся ляжаннем у ложку. Прычым, няньчыцца Дзіма з Глебам так, нібыта рабіў гэта ўсё жыццё.

Але так было не заўжды. Першы месяц даглядаць за сынам маладым дапамагала



Фота Надзеі БУЖАН.

старэйшае пакаленне сям'і, прыязджалі мамы, шмат што расказвалі і паказвалі. Цяпер малады тата стаў ужо «прафесіяналам» у змене падгузнікаў, ды і ноччу, каб прыгатаваць малому сумесь, устае пераважна ён. Каб каханая паспала даўжэй. Тым не менш, у сям'і з немаўляткам «выспацца» — немагчыма. Глеб — сапраўдны «жаваранак», прачынаецца звычайна а 5 гадзіне раніцы і пачынае патрабаваць да сябе ўвагі. Гадзін да 11 у малога прадаўжаецца час актыўнасці, пасля чаго ён на пару гадзінак засынае. Мама пачынае рабіць нешта па доме, тата едзе на вучобу, а калі Глеб прачынаецца, уся ўвага бацькоў зноў належыць толькі яму.

Самае цікавае, што нават пры такім рэжыме дня Вераніка часам ходзіць на пары. Гледзячы на зусім малое дзіця, уявіць гэта складана.

— У мяне цяпер вольнае наведванне, таму, калі ёсць сілы, абавязкова іду на заняткі, — кажа маладая мама.

Калі ж яна доўга не прыходзіць, сяброўкі пачынаюць сумаваць, а таму прыязджаюць і з задавальненнем гуляюць з Глебам, дазваляючы яго маме хоць крыху адпачыць. Дзяўчатам не цяжка, нават падабаецца такі занятак.

— А вось калі мы з Дзімам выходзім на вуліцу пагуляць з каляскай, я часам лаўлю на сабе ацэньваючыя позіркі. Нешта накшталт: «Цікава, яны добрыя бацькі ці так сабе?» — заўважае Вераніка.

Безумоўна, пасля з'яўлення сына жыццё маладой пары змянілася, але гэта іх зусім не засмучае:

— Глеб не пазбавіў нас магчымасці «пажыць для сябе», калі разумець пад гэтым шумныя кампаніі, дыскатэкі

> **Малады тата стаў ужо «прафесіяналам» у змене падгузнікаў, ды і ноччу, каб прыгатаваць малому сумесь, устае пераважна ён. Каб каханая паспала даўжэй.**

і гулянні да раніцы, — распавядае Дзмітрый. — Я і да яго нараджэння не быў асаблівым аматарам такога ладу жыцця (усяго адзін раз быў у мінскім клубе, і мне не вельмі спадабалася), а Вераніка і ўвогуле ні разу ў жыцці туды не хадзіла.

Вядома, дыскатэкі ў сталіцы — гэта задавальненне, якое каштуе не толькі сіл, але і грошай. А яны амаль кожнай маладой сям'і вельмі патрэбны. Да нашых герояў «матэрыяльныя паступленні» ідуць з трох крыніц: гэта дапамога бацькоў, падпрацоўка Дзімы грузчыкам і выплаты на дзіця.

— Прынцып расходавання грошай у нас вельмі просты, — кажа Дзіма. — Перш-наперш мы набываем тое, што неабходна малому: дзіцячае харчаванне, «памперсы», адзенне, бо ён жа расце...

Вераніка не ўтойвае: бываюць моманты, калі да чарговага «папаўнення» фінансаў застаецца тысяч сто, тады даводзіцца паднапружыцца. Часам здараюцца і непаразуменні:

— Мы звычайная пара, можам і пасварыцца. Дзіма вось курыць, а гэта немалыя выдаткі. Але добра, што крыўдзіцца доўга не ўмеем.

Аднапакаёвая кватэра, якую здымае сям'я, належыць аднаму са сваякоў Веранікі, таму за жыллё штомесяц плацяць «са зніжкай» — 200 долараў, не ўлічваючы камунальныя плацяжы.

...Размова наша падышла да завяршэння каля дзевяці вечара. Глеб пацяху пачынаў капрызіць, намякаючы, што трэба падумаць ужо і пра сон. Я ўзгадала, што, калі вучылася ў другую змену, у гэты час, здаралася, толькі вярталася з апошняй лекцыі. Раз-пораз яшчэ маглі з сябрамі і ў кавярню зайсці на паўгадзінкі. Напэўна, многія студэнты ў гэты момант бавяць час прыкладна так.

— Можа нам і цяжэй зараз, чым равеснікам, якія яшчэ не стварылі сям'ю і не нарадзілі, — разважае Вераніка. — Але я сябе настройваю, што ўсе цяжкасці каштуюць таго, што чакае нашу сям'ю ў будучым.

— Дзіма, а на цябе не «ціснe» адказнасць? Калі ўжо ёсць дзіця, ад цябе, як ад галоўнага ў сям'і, могуць патрабаваць больш, чым раней? — асцярожна пытаюся ў маладога таты.

— У жыцці абавязкова павінен быць стымул. Калі б проста вучыўся, мне б нічога не перашкаджала крыху паленавацца, лішнюю гадзіну пагледзець тэлевізар, на пары не пайсці. А цяпер я не магу так зрабіць, бо патрэбна думаць пра будучае і дзейнічаць. Хочацца як мага лепш скончыць універсітэт, атрымаць якую-небудзь дадатковую спецыяльнасць на курсах, бо карміць сям'ю на зарплату маладога настаўніка складана, — адказвае ён і зноў пераключае сваю ўвагу на сына, які на татавых руках адразу супакойваецца.

Сёння Дзмітрый сур'ёзна займаецца пошукам працы і думае распачаць уласны невялікі бізнес. Але падрабязнасці раскрываць пакуль не хоча. Сям'я вельмі марыць пра свой дом — гэта цяпер галоўнае для іх пытанне. Дзіма і Вераніка ўпэўнены, што ўсё ў іх абавязкова будзе, і маленькі родны чалавечак — зусім не перашкода для асабістага развіцця і руху наперад.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

*Веру — не веру*

# ЗА СПІНАЙ У... ЧОРНАГА КАТА



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**«Пачакай! Няхай хто-небудзь іншы пройдзе!» — у дзяцінстве часта чула такія словы ад сваёй сяброўкі, калі чорны кот пераходзіў нам дарогу. Бывала, і ў школу спазняліся (усё чакалі, што хто-небудзь пройдзе па дарозе), а іншы раз ішлі ў абход. Бедная жывёліна! Ці ж яна вінаватая, што нарадзілася чорнай? «Не сядзі на рагу стала, а то замуж не выйдзеш!» — заўсёды палохала бабуля. Але ў дзіцячым розуме не ўкладвалася: як можа гэта паўплываць на мой лёс? Малая была — слухалася, падрасла і... перастала верыць у чорнага ката. Вырашыла пацікавіцца ў сваіх сяброў і знаёмых: ці вераць яны ў прыметы?**

**Святлана ШПАКОЎСКАЯ:** — Я ў іх не веру. І ў студэнцкія ў тым ліку. «Халявы» ніколі не чакала. Я лічу, што лепш падрыхтавацца да экзамену, чым марнаваць час. Чорныя каты, павукі; калі забыў нейкую рэч, трэба абавязкова вярнуцца... Да ўсяго гэтага стаўлюся спакойна. Думаю, галоўнае правіла — гэта пазітыўнае мысленне і добры настрой. Тады ўсё атрымаецца.

**Сняжана ПЕТРАВЕЦ:** — Аб прыметах і забабонах я магу гаварыць шмат. Для большасці маіх знаёмых дзіўна, што я ў іх веру. Веру, таму што сутыкалася з імі. Аднойчы ноччу перад экзаменам бачыла сон, у якім мне казалі нумар білета, які выцягну. Але я не надала гэтаму ўвагі, а потым шкадавала... А ў прымету пра чорнага ката не веру. У мяне ўсё з дакладнасцю да наадварот. Калі я бачу, што гэтая жывёліна пераходзіць мне дарогу, то ведаю, што абавязкова ўсё будзе добра.

